© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БЕЛАРУС

Выдае Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне ў ЗША
Published by Byelorussian-American Association, Inc.
33 Norfolk Street
New York 2, N. Y.

PRICE 15 ¢ BYELARUS — WHITERUTHENIAN (BYELORUSSIAN) NEWSPAPER IN THE U.S.A. ЦАНА 15¢

Год VII. № 56 5 Ліпеня 1956 NEW YORK, N. Y., U. S. A. July 5, 1956 Vol. VII. № 56

Трагедыя эпохі

Змаганьне вольных народаў з бальшавізмам становіць сэнс і зьмест цяперашняе гістарычнае эпохі. Калі папярэднюю эпоху, да ўзьнікненьня бальшавізму, мы маглі азначыць як эпоху шуканьня нейкага новага грамадзкага ладу, пры якім інтарэсы асобы былі-б злагоджаныя зь інтарэсамі грамадзтва, зарганізаванага ў гаспадарствы, дык бальшавізм паставіў перад вольным сьветам новую праблему, праблему змаганьня якраз з бальшавізмам як з новапаўсталым найвялікшым злом.

Можа яшчэ недаволі, але ўсё-ж паважна, вольныя народы ўсьведамілі сабе, што бальшавізм абгрунтаваўся на найніжэйшых жывёльных выявах чалавечае натуры, — да гэтага сьціравала марксаўская матарыялістычная тэорыя, што адкідае духовы бок чалавечае натуры, — таму бальшавізм і спарадзіў найвялікшае зло ды зьняволіў асобу чалавека, як можа ніколі дагэтуль яна ня была зьняволеная. Фактам ёсьць, што бальшавізм прыняў у свае рады злачынныя крымінальныя элемэнты: разбойніцтва й душагубства трактуюцца бальшавіцкімі верхаводамі, як дадатныя рысы „добрага бальшавіка". „Разьвянчаньне" Сталіна й вытыканьне яму гэтых злачынстваў нічым не апраўдвае бальшавізму, а барджэй яго засуджае. Агледзеўшыся на дзейнасьць і навуку Леніна, зусім лёгічна было-б разьвянчаць і гэтага другога (ці бо першага) бальшавіцкага злачынцу. Бо што азначае ленінская навука „пралетарызацыі" жыхарства? Ленін вучыў, што перш трэба зьнішчыць клясу капіталістых прадпрыемцаў і вялікіх земляўласьнікаў, абапёршыся на работнікаў і сялян — „беднякоў, сераднякоў, а навет і кулакоў"; наступны этап — зьнішчэньне замажнейшых сялян пры дапамозе „беднякоў" і „сераднякоў"; далей — зруйнаваньне клясы сярэднязаможнага сялянства, абапіраючыся на „беднякоў"; а тады ўжо — вывараньне ў пралетарскім катле ўсяго жыхарства. Невялікая тут „філёзофія". Гэтым спосабам паслугоўваецца кажны разбойнік, што хоча зарганізаваць банду ды стаць на чале яе. Ізноў-жа ня лішне адцеміць, што саветы ўтрымваюць свой лад і дысцыпліну спосабамі й мэтадамі, што нічым ня розьняцца ад спосабаў крымінальных злачынцаў, скажам, сібірскіх „уркаў" ці іншых падобных элемэнтаў. Што змушае, прыкладам, заходня-эўрапэйскіх камуністых, якія асьмеліліся крытыкаваць маскоўскі паход супраць Сталіна, так шпарка прыносіць „пакаянную"? Некія-ж „чрэзвычайкі" хутка прыводзяць іх да бальшавіцкага парадку. Значыцца, мэтода уркаў дзеіць й на вольным сьвеце.

Цяперашнія спадкаемцы Сталіна, якія „разьвенчваюць" асобу свайго ўзгадаваўца-настаўніка, усьцяж паслугоўваюцца ягонай навукай і мэтодамі і, як у нутраным гаспадарствавым дзеяньні, так у вонкавых міжнародных дачыненьнях, кіруюцца тымі-ж злачыннымі прыхваткамі... Нельга з пэўнасьцяй сказаць, што паслужыла прычынай разьвянчаньня Сталіна, але з пэўнасьцяй можна сьцьвердзіць, што асуды ягонай дзейнасьці ніяк не становяць некага рэальнага павароту ў нутраной і вонкавай палітыцы Саветаў.

У трагічным, бо абсалютна паняволеным стане, апынулася блізу паловы жыхарства зямное кулі. І ўсё-ж найвялікшая трагедыя чалавецтва — гэта не самое паўстаньне бальшавізму, але стаўленьне да яго вольнага сьвету. Характэрнай асаблівасьцяй нашага часу ёсьць закрываньне прыгожымі шыльдамі зманлівых і шкодных праяваў, а таксама заплюшчваньне вачэй на рэчы, якія, як кажуць, моляць да Бога аб праўдзе. Калі ўзяць хоць-бы той факт, што ў савецкай катарзе пакутуе не адно жахарства Савецкага Саюзу, але й масы людзей зь іншых вольных гаспадарстваў, што так ці іначай трапілі ў шпоны савецкага МГБ ды бяз довадаў віны пагнаныя ў лягеры, дык зь зьдзіўленьнем трэба сьцьвердзіць, што ўрады й грамадзтва адпаведных краёў глядзяць на гэтую справу залішне лёгка. Асоба й воля чалавека і ў вольных краёх шануецца ня ў меру тым хартыям вольнасьцяў, што напісаныя на паперы. Рэакцыя вольных краінаў на бальшавіцкія зьдзекі над іхнымі грамадзянамі, ня кажам ужо аб грамадзянах-нявольніках Савецкага Саюзу, магла-б быць зусім іншая й напэўна ўдалая ў выніках, аднак-жа адпаведныя ўрады абмяжоўваюцца нікому ня страшнымі пратэстамі, або й зусім маўчаць, ігнаруючы справу. Ды што горшае: гэтыя-ж урады трактуюць савецкую ўладу, як законную й нармальную. Падсавецкае жыхарства ацэньвае гэтую ўладу справядлівей — як часовую ўладу злачынцаў-душагубаў. Затое заходні сьвет сіламоц цягне яе ўгару, стаўляючы на аднолькавы з сабою ўзровень, абменьваючыся падарункамі і ўзаемнай, хоць і вонкавай пашанотай (не здарма савецкія верхаводы любяць выслаўляцца: „на вышэйшым узроўні"). Горка ўспрымаць факт, што дзяржаўныя мужы ці іхныя жонкі, а то й каранаваныя асобы, прыймаюць падарункі з катніх рук, абмочаных яшчэ ў сьвежую чалавечую кроў.

Што змушае ўрады вольных краёў займаць такое становішча да савецкіх валадароў? З аднаго боку — страх, з другога — бязьмежная наіўнасьць. Даволі бальшавіком кінуць лёзунг „суіснаваньня", адкладаючы на якісь час закіданьне кайданаў на рукі ці пятлі на шыю вольным яшчэ народам, як знаныя й званыя вялікімі дыпляматамі асобы гатовыя ўваходзіць з бальшавікамі ў розныя змовы й пагадненьні, што потым ім, як кажуць, вылазіць бокам. Даволі бальшавіком выдаць на паперы нейкі быццам паслабляючы савецкую катаргу закон, як на Захадзе, сярод тых-жа кіраўнічых палітыкаў знаходзяцца людзі, гатовыя паверыць, што бальшавізм ступіў на гуманітарную дарогу. Ніяк не зацьвердзіцца ў вольным сьвеце тая праўда, што як воўк ня можа стацца ягнём, як чорт ня можа перарадзіцца ў анёла, так бальшавізм *ня можа* пайсьці гуманітарнаю дарогаю. І пры кажнай нагодзе захад гатоў ісьці на розныя пагадненьні з бальшавізмам, не здаючы сабе справы з таго, што ў мамэнт, калі бальшавікі пачуюць запраўдную сілу, яны накінуць кайданы на вольныя народы.

Калі-б бальшавізм быў ацэньваны ўрадамі вольных гаспадарстваў, як ён ацэньваецца падняволным савецкім жыхарствам і калі-б адпаведна да гэтага ўстанаўляліся дачыненьні да бальшавіцкіх тыранаў - верхаводаў, дык ужо да гэтага часу бальшавізм мусіў-бы ўпасьці: яго ўжо няраз падымаў ад упадку вольны сьвет, які вядзе з бальшавізмам змаганьне.

І яшчэ дзіва: калі фактычна адны ЗША ставяць супраціў бальшавізму больш катэгарычна, дык ім перашкаджаюць у гэтым якраз тыя гаспадарствы, якім пагроза бальшавізму бліжэйшая, як Ангельшчына ды Францыя. Відавочна, іх палітыкі кіруюцца думкай: „Хай станецца, толькі-б ня пры мне". Ды ўсё слабее наважанасьць рэальнага змаганьня. У выніку ўсяго гэтага бальшавікі ўсьцяж і ўсюды замацоўваюць за сабою пазыцыі ды ўсьцяж зьдзекуюцца і над воляй, і над гонарам чалавечым, і над урадамі вольных гаспадарстваў. Якія-ж учынкі іхныя й якія праявы паставяць Захад на становішча наважнага й рэальнага змаганьня з бальшавізмам? І калі гэта станецца? Відаць, тады, калі да таго, каб сказаць „позна ўжо", застанецца адна часінка часу.

НАСЬПЕЛАЯ СПРАВА

Праз гады свайго йснаваньня паасобныя нацыянальныя групы ў Задзіночаных Стэйтах Амэрыкі вытварылі сваеасаблівыя амэрыканскія формы арганізаванага грамадзкага жыцьця. Важная адзнака гэтага жыцьця — імкненьне кажнай нацыянальнай групы да стварэньня свае цэнтральнае нацыянальнае рэпрэзэнтацыі ў выглядзе галоўнай арганізацыі ўсёй нацыянальнай групы — арганізацыі арганізацыяў. Гэткія нацыянальныя рэпрэзэнтацыі творацца звычайна з прадстаўнікоў існуючых дзейных арганізацыяў і ўстановаў ды носяць назовы кангрэсавых радаў, лігаў, канвэнцыяў, камітэтаў, канфэрэнцыяў і да г. п.

Гэткія цэнтральныя рэпрэзэнтацыі аказаліся вельмі карыснымі ня толькі для каардынацыі нутранога жыцьця дадзенай нацыянальнасьці, але й для сувязяў зь іншымі нацыянальнымі групамі, для кантактаў з амэрыканскімі ўрадавымі й грамадзкімі ўстановамі, для лучнасьці з пазаамэрыканскімі народамі, і, у канцы, — калі гэта толькі магчыма — для сувязяў з народамі свайго паходжаньня. Для ўсіх гэтых важных мэтаў вельмі патрэбная цэнтральная арганізацыя, арганізацыя, што мае маральную аснову й права выступаць ад імя ўсёй нацыянальнай групы. Вось дзеля гэтага бальшыня нацыянальнасьцяў у ЗСА гэткія свае арганізацыі й стварыла даўно, прыкладам чаго Украінскі Кангрэсавы Камітэт, Славацкая Ліга, Кангрэс Амэрыканскай Палёніі, й г. д.

Ня мае тымчасам падобнай цэнтральнай арганізацыі беларуская нацыянальная група. Галоўнаю прычынаю гэтага — „маладосьць" гэтай групы — усяго колькі год арганізаванага існаваньня. Ды калі цяжка было думаць пра гэткую цэнтральную беларускую арганізацыю колькі год таму, калі масавая беларуская палітычная імігрruncыя яшчэ толькі зьявілася ў ЗСА й толькі пачынала ўростаць у амэрыканскае жыцьцё, дык сяньня гэтая справа вельмі зьмянілася.

Новая імігрruncыя — адзначаюць гэта ўсе — нязвычайна лёгка й шпарка асвойчылася тутка й улілася ў амэрыканскі быт. Шмат хто мае ўжо й амэрыканскае грамадзянства ды ў паўніні карыстае з усіх правоў дэмакратычнай Амэрыкі. Усталявалася за гэты час і беларускае арганізацыйнае жыцьцё ў ЗСА, выявіліся беларускія дзейныя асяродкі, замацаваліся пэўныя сталыя формы арганізаванай грамадзкай дзейнасьці. Сяньня ў Задзіночаных Стэйтах Амэрыкі існуе ўжо каля трыццацёх бела-

(заканчэньне на 3 б.)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

ВЕРНЫ СЫН БЕЛАРУСІ

Сёлета беларускае грамадзтва на эміграцыі адзначае патройны юбілей — 60 год жыцьця, 40 год беларускай адраджэнскай працы і 35 год сьвятарства — свайго выдатнага дзеяча а. др. Пятра Татарыновіча, — арганізатара й кіраўніка беларускай калёніі ў Рыме, загадчыка беларускай сэкцыі Ватыканскага радыё, рэдактара часапісу „Зьніч" ды дзейнага сябры шмат якіх міжнацыянальных і беларускіх арганізацыяў.

Дастойны Юбілят належыць да маладзейшых із старога пакаленьня беларускіх дзеячоў. Радзіўся 2-га чырвеня с. ст. 1896 г. у в. Гайнін на Случыне. Пасьля пачаткавай і сярэдняй навукі ў Слуцку едзе на тэалёгічныя студыі ў Пецярбург, дзе ў 1916 г. стае сябрам Акадэміцкай беларускай арганізацыі, празь якую прайшло ці мала нашых выдатных дзеячоў-адраджэнцаў. Падзеі Першай Сусьветнай вайны змушаюць нашага Юбілята перанесьці пачатыя студыі спачатку ў Менскую новаарганізаваную духоўную сэмінарыю, а пасьля ў Влоцлавак (Польшча), дзе ён і быў высьвячаны, як эмігрант, на сьвятара 12-га чырвеня 1921 г. Трапіўшы з часам у Рым, Юбілят давяршае свае студыі, здабыўшы ў 1949 г. дактарат.

Калі ў выніку Рыскага трактату частка Случчыны дасталася Польшчы, Юбілят вярнуўся з свае першае эміграцыі ды ўсе сілы й запал маладога сьвятара аддае беларускай рэлігійна-адраджэнскай працы. Ягоныя палкія рэлігійна-патрыятычныя казаньні, якім заўсёды таварышыла прыгожая дыкцыя й мастацкі гэст, ламалі лёд нацыянальнай нясьведамасьці й абыякавасьці, спрычыненай векавой няволяй беларускіх народных масаў, здабываючы беларускаму адраджэньню гарачых патрыётаў, а сабе назаўсёды шчыра адданых прыяцеляў. Гэта й было прычынай, што няспрыяльная беларускаму рэлігійна-нацыянальнаму адраджэньню польская духоўная ўлада так часта кідала а. Татарыновіча зь месца на месца: Пінск, Наваградак, Баранавічы, Слонім, Белышчына. Аднак, у найцяжэйшых часох польскага рэжыму, калі Юбілят ня мог вольна парушацца — штогоду з усіх тых мясцовасьцяў, дзе працаваў раней, ішлі большыя й меншыя групкі беларускіх патрыётаў-пільгрымаў у Вільню, каб узяць удзел у супольнай беларускай працэсіі ў Кальварыю, штогоду ўдала арганізаванай а. Адамам Станкевічам. Ішлі сотні кілямэтраў праз усю бадай Заходнюю Беларусь, пехатой, загарэлыя й засьмяглыя ад сонечнае сьпякоты, зь беларускай рэлігійнай песьняй на вуснах, каб у супольным разважаньні крыжовай дарогі Хрыста на Гальготу выпрасіць Бога зірнуць на мукі расьпятага Беларускага Народу... Яны прыносілі ў Вільню прывітаньне й духовае далучэньне свайго душпастыра . . .

Другая Сусьветная вайна з усімі ейнымі жахамі на прасторах нашай Бацькаўшчыны разгарнула перад няўтомным Юбілятам новыя магчымасьці службы свайму Народу. Уцёкшы ў



1940 г. з бальшавіцкага арышту на эміграцыю, ён апыняецца на становішчы культурна-асьветнага рэфэрэнта й капэляна арганізаванай беларускай эміграцыі на Захадзе, а пры першым проблеску шырэйшай працы на Бацькаўшчыне, з усёй так характэрнай яму жасьцяй працавітасьці аддаецца справе рэлігійна - маральнага адраджэньня зруйнаванага бальшавікамі й вайной краю ў ягонай шматпакутнай сталіцы — Менску.

Шчасьліва ацалеўшы ад гэстапаўскага пагрому каталіцкага духавенства ў Менску, на настайнае намаганьне вернікаў, што перахоўвалі яго, Юбілят пакідае сталіцу й праз краі Заходняй Эўропы дастаецца ў 1945 г. ў Рым, каб тут у цяжкую пару, калі шукальнікам шляхоў дзеля вызваленьня паняволеных бальшавіцкай Масквой народаў настырліва паказвалі на пераходныя пункты дзеля „звароту дадому", прадставіць беларускую справу ў Ватыкане ды, заручыўшыся бласлаўленьнем і памогаю Сьв. Пасаду, арганізаваць свой беларускі пераходны пункт дзеля далейшай працы над вызваленьнем Бацькаўшчыны ў доўгіх гадох эміграцыі. Праз гэты пункт прайшлі здэмабілізаваныя жаўнеры-Беларусы чужых арміяў, беларускія сяляне, вывезеныя на прымусовыя работы, беларускія палітычныя эмігранты, якіх вайна загнала ў краі паўдзённай Эўропы ды Блізкага Усходу, каб атрымаўшы патрэбную матар'яльную й духовую памогу, разбрысьціся ў розныя краі сьвету дзеля далейшай службы Бацькаўшчыне. Гэты пераходны пункт Юбілят паступова ператварае ў вадну з актыўнейшых беларускіх эмігрыйных калёніяў — з належнай палітычнай рэпрэзэнтацыяй, беларускай сэкцыяй Ватыканскага радыё, студэнцкім асяродкам, сталым часапісам „Зьніч" і пэрспэктыўным выдавецтвам., якое дало ўжо ў яго перакладзе Новы Запавет, Quo Vadis ды інш.

Вельміпаважаны Юбілят, як беларускі нацыянальны дзеяч ідэялёгічна азначанага кірунку, заўсёды мужна зносіць горыч цяжкой няўдзячнасьці, асабліва цяжкой тады, калі яна выходзіць з таго боку, адкуль найменш трэба было-б спадзявацца.

Сьвята Дастойнага Юбілята дае нам нагоду ганарыцца адным з выдатнейшых сваіх дзеячоў, якога пры гэтак сьціплых фізычных сілах абдараваў Бог нязвычайнай сілай волі, няўтомнай працавітасьцяй і самаадданасьцяй справе вызваленьня Бацькаўшчыны, да шчыра зычыць яму дачакацца таго шчасьлівага дня, калі ідэалы Беларускага Народу і самога Дастойнага Юбілята стануцца запраўднасьцю, а Вольная Бацькаўшчына належна адзнача заслугі свайго вернага Сына.

А. Шукялойць

ПАЎТАРЭНЬНЕ НЭП'У?...

Паважную трывогу апошнімі часамі выклікалі досыць частыя ды масавыя звароты дадому эмігрантаў з СССР і ягоных сатэлітаў. Зьява гэтая выклікае зьдзіўленьне шмат у каго з эмігрантаў ды грамадзтва краёў, што гэтых эмігрантаў прынялі. Але не адно гэта выклікае зьдзіўленьне людзей вольнага сьвету. „Разьвяньчаньне" Сталіна, нутраное паслабленьне рэжыму ў СССР, праўдападобнае выданьне закону аб ліквідацыі „концлягераў" у СССР, настырлівыя прапановы савецкае ўлады аб мене рознымі дэлегацыямі, улучна з рэлігійнымі, прыймо, а навет і прапаганда з Савецкага боку пасылак пачак з ежай ці адзеньнем ў СССР, загад аб скарачэньні чырвонае арміі на 1.200.000, абвешчаньне рэабілітацыі раней засуджаных і зьнішчаных — усё гэта неспадзявана сыплецца з Крамля, як зь дзіравае шапкі, і зьдзіўляе заходніх палітыкаў ды выклікае шмат ў каго на Захадзе пэўнасьць, быццам характар савецкае ўлады мяняецца на лепшае. А вось гэтае апошняе й ёсьць першаю мэтаю ўсіх сучасных савецкіх ходаньняў, што маюць міжсобку цесную сувязь ды і аднэй гэтай мэтай і могуць быць вытлумачаныя. Выглядае, быццам паўтараецца савецкі НЭП, гэтым разам палітычна-псыхалягічны, ці, паводля Леніна, даецца крок назад.

Мінулы НЭП і цяперашні выкліканыя бязвыходным станам савецкае гаспадаркі й агульнага палажэньня савецкае ўлады. Але ў вабодвух выпадках савецкія спэцы-душахваты спрытна ўплятаюць справу звароту эмігрыцыі і ў абодвух выпадках патрапляюць ашукваць заходніх палітыкаў ды і ў часе заняпаду рабіць агрэсыўную афэнзыву.

Калі-б адказаць на пытаньне: „Чаго людзі ўцякаюць на Захад із-за зялезнае заслоны?" (тыя, каму гэта магчыма ўдаецца) і на другое „што пабачыць на Захадзе сьвежы ўцякач з СССР? дык прыйзде, хоць мо й ня поўны адказ і на пытаньне: „Чаму варочаюцца эмігранты з Захаду за зялезную заслону?"

Пэўна-ж, чалавек пакідае бацькаўшчыну не дзеля таго, што яна яму абрыдала, а спадабалася нейкая іншая краіна. Ён шукае помсты за ўсе зьдзекі над ім і над ягоным грамадзтвам ды шукае ратунку-памогі супраць тыранскае ўлады. І можна сабе ўявіць псыхічны стан эмігранта, а тым балей сьвежага ўцекача з СССР, калі ён бачыць некі дзікі страх перад саветамі ў Эўропе, або абыякавасьць ці хоць-бы й паказное сяброўства з савецкімі верхаводамі ў Амэрыцы. А што ўжо пэўнае, дык гэта шчырае задаволенье па ўсім вольным сьвеце з „палепшаньня" бальшавіцкае ўлады, задаволенье ізь цьвёрдай стабілізацыі такога палітычнага стану, пры якім была-б спыненая савецкая агрэсія на цяперашніх рубяжох, а можа навет і пры невялікіх новых захопах. Ці пацяшае эмігранта такі стан рэчаў? Пэўна-ж не, а даводзіць да роспачы й духовага заламаньня шмат каго.

Паўторны савецкі НЭП, у ягонай цяперашняй адмене, асаблівa стварае грунт для ўраджайнай працы савецкіх душахватаў. І як першы НЭП пазначыўся ладным зваротам эмігрыцыі, так пачынаецца штось падобнае й цяпер.

Амэрыканская Сэнацкая Камісія вядзе адмысловае сьледзтва, як розныя савецкія палітычныя прадстаўнікі чыняць маральны ціск на эмігрантаў з мэтай рэпатрыяцыі іх. Што гэты ціск — наглы й усебаковы — ёсьць, гэта бязумоўна. Бо чаго-б тады сядзелі у розных краёх савецкія прадстаўнікі, калі-б ім унемагчымілася шпіёнская й правакацыйная дзейнасьць? Але гэты маральны ціск не заўсёды дае пажаданыя саветам вынікі: дзеля гэтага патрэбна адпаведная, як кажуць, атмасфэра. Гэткую атмасфэру стварае цяперашні савецкі НЭП, а фактычна не сам НЭП, а незразуменьне яго й неналежная рэакцыя на яго на Захадзе.

Чаго першым чынам хочуць дасягнуць саветы цяперашнім псыхалягічным НЭП'ам? Гэта можна зьлюстраваць двама наглядальнымі фактамі. Першы. Калі саюзьніцкае войска пачало памагаць савецкаму лавіць і прымусова вывозіць савецкіх грамадзянаў, дык побач з фактамі самагубстваў, каб толькі ня трапіць у Савецкі Саюз, былі й факты абсалютна дабраахвотнага выезду. Вось аўтэнтычныя словы аднаго эмігранта, чалавека інтэлігэнтнага й бескампрамісовага ворага бальшавізму, які быў сьведамы таго, што яго чакае ў саветах толькі зьнішчэньне; „Скончана ўсё, зьгінула ўсякая надзея, рабом нарадзіўся, еду ў рабства паміраць" . . . Гэта ён адказаў на просьбы і ўгаворы ягоных прыяцеляў, што былі разам зь ім у Нямеччыне. Другі факт. Было на Беларусі пад нямецкай акупацыяй. Партызаны забілі старасту аднае вёскі. Сын забітага неаднокраць, а сьпярша можа штодня, прыходзіў у павятовы адзьдзел паліцыі, якая была пад загадам Немцаў, прасіць памогі, каб памсьціць за бацьку. Ён упэўнена даводзіў, што ўвесь партызанскі адзьдзел можна лёгка пералавіць. Але ягоную просьбу зьігнаравалі. Па некаторым часе, не пазьней як за 2-3 месяцы, гэты-ж сын забітага апынуўся ў тым самым партызанскім адзьдзеле, што выканаў забойства ягонага бацькі, і найбольш энэргічна пачаў імсьціцца тым, у каго раней прасіў памогі.

Што павяло на гэткія ўчынкі абодвух гэтых людзей? Неадпаведныя і ў вабодвух дадзеных выпадках нялюдзкія дачыненьні да іхнае крыўды-бяды. Ды гэткія факты, хоць далёка не адзіночныя, але ўсё-ж і ня масавыя. Саветы хочуць, каб такія факты сталіся масавымі й у гэтым кі-

(заканчэньне на 5 б.)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БАЛЬШАВІЦКІ ЭРЗАЦ ЗАМІЖ НАВУКОВЫХ УСТАНОВАЎ

У СУВЯЗІ З РАЗБУРЭНЬНЕМ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК

Сёлета, 9-га ліпеня, спаўняецца 20 год існаваньня скамунізаванае Акадэміі Навук БССР, што паўстала на аснове разгромленае бальшавікамі Беларускае Акадэміі Навук.

Вышэйшая навукова-дасьледная ўстанова Беларусі — Беларуская Акадэмія Навук (скарочана БАН), праіснавала 7 год — ад 13. X. 1928 году да 9-га ліпеня 1936 г., — паўстаўшы з рэарганізаванага Інстытуту Беларускае Культуры (скарочана — Інбелкульту), заложанага 20-га лютага 1922 г.

Найбольш прадукцыйным у навуковым дачыненьні быў час дзейнасьці самога Інбелкульту ды першыя гады йснаваньня БАН (1922-1930 гг.), агулом бяручы — 8 год. За гэты час Інбелкульт-БАН, пры надта няспрыяльных абставінах — вельмі абмежаныя матар'яльныя сродкі, нястача на месцы патрэбнай колькасьці навукоўцаў, абсталяваньня, будынку, выпрацаванай і цьвёрда ўсталенай беларускай навуковай тэрміналёгіі, пачынаючы літаральна ўсё чыста нанава, патрапіў быў прыцягнуць да супрацоўніцтва выдатных наўчоных-спэцыялістых, высока паставіць навукова-дасьледную працу ува ўсіх галінах навукі ды здабыць заслужаны аўтарытэт у навуковым сьвеце не адно ў краі, а й за межамі яго.

У кароткім газэтным артыкуле немагчыма пералічыць усе салідныя навуковыя працы, тэрміналёгічныя й агульныя слоўнікі, вынікі ўсіх археалёгічных ды іншых экспэдыцыяў, гістарычныя манаграфіі й зборнікі крыніцаў, што так былі ўзбагацілі навуку. Варта яшчэ адцеміць, што маладая тады беларуская навука, шырака разгарнуўшы вывучэньне свайго краю й народу, займала не апошняе месца і ў міжнародным памеры.

Беларускія наўчоныя бралі ўдзел у міжнародных навуковых кангрэсах і выстаўках, выменьваліся сваімі выданьнямі з навуковымі ўстановамі цэлага сьвету, правялі ў Менску ў 1926 годзе паважную слявістычную Акадэмічную Канфэрэнцыю ў справе рэформы беларускага правапісу й графікі з удзелам прадстаўнікоў слявістыкі Захаду.

Беларуская Акадэмія Навук да пачатку 30-х год была ўжо ня толькі вышэйшай навукова-дасьледнай установай, а запраўдным цэнтрам усяе нацыянальна-адраджэнскае працы ў краі.

Зразумела, што гэта не ўкладалася ў рамкі новага павароту курсу ў г. зв. „нацыянальнай палітыцы камуністычнае партыі", ськіваванага на нівэляцыю ўсялякіх нацыянальных апрычонасьцяў, як „буржуазных перажыткаў", з канчальнай мэтай ператварэньня ўсяе бальшавіцкае шматпляменнае імпэрыі у вадну адналітую, суцэльную „сацыялістычную савецкую" дзяржаву з адным г. зв. „савецкім народам".

Пяршынство ў гэтым савецкім народзе дастаў адно расійскі народ як народ „перадавой культуры, рэвалюцыйных традыцыяў і практыкі". Усялякае-ж культываваньне собскіх традыцыяў адменных ад гэтых „перадавых" — „варожыя праявы, зь якімі трэба бязьлітасна змагацца", як з „контррэвалюцыйнай нацдэмаўскаў ідэалёгіяй".

Таму, ад 1930 г. пачаўся быў гэнэральны наступ бальшавізму на БАН. Праз „чысткі" з арыштамі выдатнейшых нацыянальных дзеячоў, высока кваліфікаваных навукоўцаў, у працягу колькіх год ператваралі бальшавікі БАН „. . . з гнязда контррэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў у Акадэмію Савецкую, у цэнтр пралетарскай навукі" (гл. „Савецкая краіна" № 10, 1932 г., б. 5).

„Цэнтр пралетарскай навукі", ня мог, бязумоўна, далей і насіць „нацдэмаўскага" назову. 9-га ліпеня 1936 году Савет Народных Камісараў БССР за подпісам Галадзеда, ліквідаванага пасьля таксама, назоў „Беларуская Акадэмія Навук" замяніў на „Акадэмія Навук БССР" (гл. „Зборнік законаў БССР", № 18, 1936 г., пастанова 88).

Праўду кажучы, дык гэты новы назоў больш адпавядае зьместу дзейнасьці ўпрэжанай ў ваглоблі камуністычнай дактрыны акадэміі, дзе, у існасьці, засталося мала чаго беларускага.

Акадэмія Навук БССР, асабліва ў галіне гуманітарных навукаў, дый не адно ў гуманітарных, ад гэтага часу перастала быць асяродкам аб'ектыўнага й свабоднага вывучэньня свайго краю й народу. Яна замянілася на верную й пакорную служку выкананьня ўтылітарных дэмагагічна-прапагандовых патрэбаў рэжыму.

Чым-жа можа пахваліцца нявольніца рэжыму — Акадэмія Навук БССР — за сваё дваццацігадовае існаваньне, маючы ў сваім распараджэньні вялізарныя сродкі, а найгалаўнейшае — прыхільнасьць і падтрыманьне бальшавізму?

Найперш — аблiваньнем грязёю сваіх папярэднікаў, а далей — зьнявечаньнем багатай беларускай мовы на несамавіты савецка-расейска-беларускі жаргон, на г. зв. „белмову", пераліцоўваньнем гісторыі беларускае літаратуры ды бессаромным хвальшаваньнем гісторыі народу.

Маленькі прыклад: выданая Акадэмія Навук БССР у 1954 г. „Гісторыя БССР" захоп і паняволеньне беларускіх земляў царскай Расеяй канца 18-га стагодзьдзя заве „....узьяднаньнем з Расеяй, што адпавядала кроўным інтарэсам шырокіх мас беларускага народу" й даводзіць, што гэнае „узьяднаньне" .....спрыяла эканамічнаму, палітычнаму й культурнаму разьвіцьцю беларускага народу (гл. б. 124, 205).

Няўжо аўтары тае „працы" на чале із правадзейным сябрам Акадэміі Навук БССР В. Перцавым, дый сама Акадэмія ў цэлым, вераць, што Мураўёўская шыбеніца, забарона друку й карыстаньня беларускай мовай у культурным і грамадзкім жыцьці краю, або тыя бравары, ці хоць-бы й саматужныя гарбарні дарэвалюцыйнага Менску, спрыялі „разьвіцьцю эканамічнаму, палітычнаму й культурнаму беларускага народу".

Падобная лухта, прыклады якое дзе ні ступні, абніжае вартасьць ды выклікае недавер і да тых спробаў больш-менш запраўднае навуковае працы ў сьценах Акадэміі. Бязумоўна, спробы ў гэтым кірунку за 20 год былі й ёсьць, але іхная свабода асядлана ўсьцяж новымі вымогамі ўсялякіх „верасьнёўскіх, ліпенскіх" пленумаў ЦК ды зьездаў КПСС. Кажны чародны пленум ці зьезд камуністычнае партыі вызначае каркаломныя пляны, хваліцца дасягненьнямі, дае „натхненьні" да новых „крутых уздымаў" гаспадаркі й навукі, а воз надта-ж ужо марудна паўзе ўперад.

Чым-жа, прыкладам, займаецца „перадавая навука" Акадэміі Навук БССР? — Акадэмікі, дактары й кандыдаты сельскагаспадарчых навук Інстытуту сацыялістычнае сельскае гаспадаркі ды Інстытуту мэліярацыі воднай і балотнай гаспадаркі Акадэміі Навук БССР, робяць „вызначныя" паседжаньні Вучоных Саветаў інстытутаў з удзелам актыву двох суседніх калгасаў — імя X зьезду ЛКСМБ і імя Панамарэнкі ў Рудзенскім раёне (гл. „Зьвязда" з дня 5. 4. 1956 г.).

І вось гэныя „вучоныя", пасьля 28-ёх гадовае „барацьбы" (у „сацыялізьме" нічога ня робіцца проста — усюды адно „барацьба") за ўздым калгаснае гаспадаркі, нечакана „адкрываюць" прадзедаўскую „ісьціну" — поле, каб добра радзіла, патрабуе не цыркуляраў, „выязных" паседжаньняў, Вучоных Саветаў, ці ня нейкае „барацьбы", а звычайнага, паспалітага, каравячага, конскага, сьвінога й курынага гною ды зусім не „навуковай", а такой простай, ардынарнай гнойнай жыжкі!

Дзеля таго-ж, каб зрабіць „адкрыцьцё", што „лубін — гэта такое зялёнае ўгнаеньне, якому й цаны няма", ня трэба быць кандыдатам сельскагаспадарчых навук Стралковам. Гэта ведаў кажны няпісьменны дзядзька, пакуль яшчэ поркаўся на сваёй собскай гаспадарцы ды не пачаў, заміж працаваць, „спаборнічаць" ды рабіць „крутыя ўздымы" сацыялізму.

Тымчасам гэта, як і прапанова калгасьніцы Дабрыцкай: „кажнаму калгасьніку даць на грамадзкія палі два-тры вазы гною" падаецца як навукова дасьледная дзейнасьць ды „абмен перадавога вопыту"!

Пакуль жыве й пануе камуністычны прыгон, датуль навуковая думка будзе скаванай, а навукоўцы, „у парадку вымены перадавое практыкі", будуць „спаборнічаць" на прапанову калгасьніцы В. Аскерка ў „накапленьні гною", хоць за 20 год існаваньня пад'ярэмнае Акадэміі яго „накапілася" аж надта!

Заданьнем-жа беларускіх навукоўцаў у вольным сьвеце — бязупыннае ачышчэньне навукі ад таго бальшавіцкага сьмяцьця й гною.

А. Сьвіслацкі

СПАТКАНЬНЕ ПРЭЗЫДЭНТА БНР З ДЭПУТАТАМІ АНГЕЛЬСКАГА ПАРЛЯМЭНТУ

7-га траўня 1956 году ў будынку Брытанскага Парлямэнту адбылося прыняцьце з нагоды ўгодкаў 25-га Сакавіка, зладжанае Ангельска-Беларускім Таварыствам. Гаспадаром прыняцьця быў дэпутат Брытанскага парлямэнту сп. Д. Ормсбі Гор — старшыня Таварыства, а першым гасьцём — Прэзыдэнт БНР сп. М. Абрамчык. Апрача Д. Ормсбі Гор у прыняцьці ўзялі ўдзел 11 дэпутатаў Брытанскага парлямэнту розных палітычных партыяў, ведамыя дзеячы, выдатныя асабістасьці рэлігійнага й культурнага жыцьця В. Брытаніі, прадстаўнікі эміграцыі паняволеных Масквой народаў, журналістыя ангельскай і замежнай прэсы. Беларускую эміграцыю рэпрэзэнтавалі а. Др. Ч. Сіповіч, ды старшыні беларускіх арганізацыяў Ангельшчыны.

НАСЬПЕЛАЯ СПРАВА

Заканчэньне

рускіх арганізацыяў рознага прызначаньня й характару зь дзесяткамі большых і меншых аддзелаў.

Гэта ўсё прамаўляе за тое, што й сярод беларускай нацыянальнай групы ЗСА ужо цалком насьпелі ўмовы для стварэньня свае цэнтральнае рэпрэзэнтацыйнае арганізацыі. Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне, якое дасюль спаўняе шмат з заданьняў гэткай цэнтральнай арганізацыі, на сваім шостым кангрэсе 28 траўня 1955 г. ў Нью Ёрку, улічыўшы гэтую насьпелую патрэбу, вынесла пастанову аб выступленьні зь ініцыятывай стварэньня „беларускай цэнтральнай рэпрэзэнтацыі ў ЗСА, складзенай з паўнамоцных прадстаўнікоў існуючых арганізацыяў і ўстановаў".

У выніку гэтай пастановы Галоўнаю Управаю БАЗА яшчэ летась і была пакліканая адмысловая камісія для вывучэньня справы ды ўлажэньня праекту статуту плянаванай арганізацыі. Праект гэты надовечы й быў прыняты Галоўнаю Управаю БАЗА, а пазьней ў канцы траўня с. г. апрабаваны й канфэрэнцыяй старшыняў аддзелаў БАЗА, ды неўзабаве будзе накіраваны ўсім беларускім арганізацыям у ЗСА для абзнаямленьня зь ім з адначаснаю прапановаю ўзяць удзел увосені 1956 г. у першай арганізацыйнай канвэнцыі будучай цэнтралі, на якой будзе прынятая канчальная форма статуту ды маюць быць абраныя першыя ўлады галоўнай арганізацыі Беларусоў Амэрыкі.

Аб патрэбе й вялікіх нацыянальна - грамадзкіх карысьцях гэткай цэнтральнай арганізацыі ў рэпрэзэнтаваньні палітычна-нацыянальных і культурных інтарэсаў амэрыканскіх Беларусоў ды ў справе прапагаваньня на прасторы Амэрыкі справы вызваленьня Беларусі, для кажнага грамадзка думаючага ня можа быць ніякога сумлеву. Вось дзеля гэтага трэба прыкласьці ўсім якнайбольш добрай волі й натугаў, каб гэтая нашая цэнтральная нацыянальная рэпрэзэнтацыя на толькі паўстала, але каб ейнае выбранае кіраўніцтва адразу атрымала належны для гэткай адказной дзейнасьці аўтарытэт і маральную апору сярод Беларусоў ЗСА ды магло паўнапраўна рэпрэзэнтаваць усё беларускае арганізаванае жыцьцё Амэрыкі. *А. Г.*

© PDF: Kamunikat.org 2011
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

25 САКАВІКА У ЗША

Нацыянальна-вызвольная праца новае беларускае эміграцыі ў ЗША паступова здабывае прыхільнасьць і сымпатыі амэрыканскага грамадзтва да справы вызваленьня беларускага народу з маскоўска-бальшавіцкае няволі. Моцна зазначылася гэта сёлета ў 38-ыя ўгодкі абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі. З гэтае нагоды ў вабарону беларускае праўды й у падтрыманьне змаганьня Беларусаў за сваю волю й незалежнасьць выступалі ў Амэрыканскім Кангрэсе 6 кангрэсмэнаў, мовы якіх зьмешчаныя ў кангрэсавым дзёньніку "Congressional Record": 15 сакавіка К. Заблоцкі з Вісконсын (Кангр. Рэкорд № 48); 19 сакавіка — Д. Флюд з Пэнсыльваніі (К. Р. № 48); 20 сакавіка — В. Анфусо з Нью Ёрку (К. Р. № 49); 26 сакавіка — К. Б. Кітынг зь Нью Ёрку (К. Р. № 53); 29 сакавіка — Д. Д. Дынгель зь Мічыгэн (К. Р. № 56); 9 красавіка — Дж. Лесінскі зь Мічыгэн (К. Р. № 57).

25 Сакавіка праклямаваны Днём Беларускае Народнае Рэспублікі адмысловымі праклямацыямі губэрнатараў у штатах — Нью Ёрк, Нью Джэрсы, Мічыгэн і ў месьце Нью Ёрку.

Прынагодныя да 38-ых угодкаў абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі артыкулы зьмешчаныя ў шмат якіх большых і меншых амэрыканскіх газэтах. Цікавы артыкул зьмясьціла газэта New York Herald Tribune ад 2 красавіка ў справе зарэагаваньня Масквы праз часапіс „Новое Время" на абвешчаньне Мэрам Вагнэрам Беларускага Дня ў Нью Ёрку; таксама ў гэтай справе быў зьмешчаны камэнтар на заяву ў часапісе „Новое Время" у New York World-Telegram; Brooklyn Daily 30 сакавіка зьмясьціў здымак з акадэміі 25 Сакавіка ў Нью Ёрку з прынагодным артыкулам; нямецкі штодзёньнік Staats Zeitung Herold з 18 сакавіка зьмясьціў кароткую гістарычную даведку аб 25 Сакавіку й праграму сьвяткаваньня Дня Незалежнасьці ў Нью Ёрку. Таксама спагадлівымі артыкуламі адазваліся газэты іншых паняволеных народаў: украінскі штодзёньнік — „Свабода", польскі — „Новы Сьвят", славацкі тыднёвік — „Еднота".

Сёлета Дзень 25 Сакавіка сьвяткаваўся ўрачыста ў ваддзелах БАЗА Нью Ёрк, Кліўленд, Чыкага, Дэтройт. Разам зь Нью Ёркаўскім сьвяткавалі аддзелы: Саўт Рывэр, — Нью Брансўік, Стэмфорд, Спрынгфільд, Бікан. У праграму Сьвята ўваходзілі Божыя Службы, радыяперадачы, урачыстыя акадэміі ды мастацкія імпрэзы. У сьвяткаваньні бралі ўдзел, апрача Беларусаў, прадстаўнікі іншых нацыянальнасьцяў ды амэрыканскага грамадзтва. Асабліва паважная была рэпрэзэнтацыя ў Нью Ёрку.

МАСКОЎСКІЯ „ВОДГУКІ"

З прычыны абвешчаньня Беларускага Дня ў Нью Ёрку, маскоўскі часапіс „Новое Время" выступіў з брутальным абвінавачаньнем Мэра места Нью Ёрку сп. Вагнэра ды з бруднымі й ілжывымі выпадамі супраць Рады БНР, падаючы быццам Рада БНР увяла была на Бацькаўшчыне „принудительный труд" і што пры савецкай уладзе „народ" яе прагнаў. Але брутальная бальшавіцкая хлусьня нікога не праконвае.

Расейская Нью Ёрская газэта „Новое Русское Слово", зьмясьціўшы 18 і 22 сакавіка ў хроніцы праграму сьвяткаваньня 25 Сакавіка, ня вытрывала аднак, як і бальшавікі, і ў дзень самога сьвята азвалася пашквільным лістом „беларускіх фэдэралістых".

ЗАБРАНЫ КРАЙ

(Успаміны й развагі старэйшага галавека)

Ужо каля паўтары сотні гадоў наш народ называе свой край „Забраны Край", але ўвесь гэты час ня траце надзеі на ягонае вызваленьне. Наезьнік дужы, дык наш народ на свае собскія сілы не спадзяецца, але ён вера ў сілу, справядлівасьць ды магутнасьць заходніх народаў і спадзяецца, што гэтыя высокародныя заходнія народы прыдуць вызваляць яго ад Маскаля.

Ад самога пачатку маскоўскага забору ён спадзяваўся на Францыза, што той прыдзе й вызвале наш край ад Маскаля. Ды калі гэты Француз у 1812 годзе прышоў нас вызваляць, дык тут-жа трагічна й загінуў на вачох гэтага самага нашага народу. Але трагедыя Француза на Бярозе не пазбавіла нашага народу веры ў сваё вызваленьне. Народ упэўнена казаў, што Француза перамаглі не Маскалі, а зусім іншыя два генэралы: Халадзіла й Галадзіла. Калі Француз уцякаў з Барысава, дык пакінуў у Барысаве шапку й рукавіцы. Наш жыхар моцна верыў, што Француз вернецца ў Барысава па сваю шапку й рукавіцы, а калі вернецца, дык і вызвале наш край ад Маскаля. Гэткая вера ў нашага народу была аж да вайны 1914 году.

Наш селянін ведаў, што Францускі цар борзда ўцёк спад Барысава, а ягоныя жаўнеры марудна цягнуліся дамоў. І вось калі гэтыя французскія жаўнеры папрывалакаліся дамоў, дык цар у іх пытаўся, як ім паводзілася ў дарозе. Жаўнеры свайму цару адказалі: „Бедныя сяляне нас грэлі, кармілі й хавалі ад Маскалёў, а Маскалі й паны нас забівалі й вешалі". Французкі цар адказаў: „Ну, дык я-ж іх павешаю". Дый пайшоў Француз вайной на рускага ў Крым. Француз датуль ваяваў у Крыме, пакуль не перамог Рускага. Рускі цар папрасіў замірэньня. І пытае ў Француза, чаго ён хоча, а Француз адказаў: „Хачу ад цябе толькі аднаго: вызваль сялян ад прыгону". Рускі цягнуў, марудзіў, але хоцькі-ня-хоцькі, а змушаны быў вызваліць сялян ад прыгону.

У Шэйна у III томе запісана гутарка селяніна Горадзенскай губэрні з псаломшчыкам Расейцам: „Паніч, нашто вы свае царскія дзьверы павесілі ў нашай царкве? Пачакай, пачакай, прыдзе Француз, тады мы гэтыя вашы царскія дзьверы з свае царквы выкінем".

Калі Расейцы правялі Вялікі Сібірскі Чыгуначны Шлях, дык абвесьцілі па валасьцёх і на Беларусі, каб сяляне запісваліся на перасяленьне ў Сібір. Адна суседка прыйшла да нас і пытае ў мамы: „Ці запісаўся-ж ваш гаспадар у Сібір"? А мама адказала, што не. А яна пад тое слова: „Наш-жа край забраны, дык іншыя цары Рускаму загадалі выйсьці з нашага краю. Рускі адказаў ім: „Я хоць і выйду з гэтага краю, але людзей не пакіну, бо я іх заваяваў. У мяне зямлі шмат у Сібіры, дык вось я іх і перасялю ў Сібір". Суседка далала: „Хто запішацца дабрахвотна й сам выедзе, дык той лепшыя землі зойме, а каго сілай пагоняць, дык таго пасадзяць дзе пападзя". Гэткая пагалоска тады была пашырана па нашых вёсках.

Настала першая сусьветная вайна, рэвалюцыя, а пасьля акупацыі — то нямецкая, то расейская, то польская. Тады хадзіў гэткі анэкдот па вёсках, што быццам бальшавік спытаўся ў беларускай бабы: „Ці хацела-б ты, каб мы Палякоў прагналі з вашай зямлі"? Баба адказала: „Я-б хацела, каб вы Палякоў

ЎСЕБЕЛАРУСКІ КАНГРЕС У МЕНСКУ

18-31 СЬНЕЖНЯ 1917 ГОДУ*)

(З успамінаў дэлегата Кангрэсу)

Аднаго разу абласьнікі патрабавалі, каб зь імі лічыліся на Кангрэсе, як з адзінымі прадстаўнікамі Віцебскай і Магілеўскай губэрняў. Вайсковыя гэтых губэрняў запратэставалі. Калі мандатная камісія падлічыла дэлегатаў гэтых губэрняў, дык выявілася, што дэлегатаў вайскоўцаў, сялянаў і работнікаў, што не належалі да абласьнікоў, больш як самых абласьнікоў. Пасля гэтага на адным пленарным паседжаньні дэлегат ад Віцебшчыны К. Езавітаў выказаўся, што ў сям'і Віцяблян ёсьць выradкі, і ад гэтага няпрыемна ўсім ім, ды тут-жа дадаў прыказку: „Адна паршывая авечка ўсё стада брудзіць". Абласьнікі абурыліся й пагражалі пакінуць Кангрэс, калі Езавітаў ня возьме сваіх словаў назад. Езавітаў зьвярнуўся да Кангрэсу, заявіўшы, што згаджаецца забраць свае словы толькі на жаданьне Кангрэсу, а перапрашаць абласьнікоў ня мае замеру, бо яны сваёю прапановаю зьняважылі ўсіх Віцяблянаў. На гэтым канфлікт скончыўся.

Ужо пад канец Кангрэсу прыехаў новы дэлегат ад Віцебскай губэрні — сьвятар. Ён у палкай прамове вітае Кангрэс ад імя „Витебского Совета Крестьянских, Рабочих и Солдатских Депутатов". Адна мысьціна ягонае прамовы: „... великороссы, малороссы и белороссы составляют единый неделимый русский народ. Как нельзя единой Св. Тройцы поделить на три отдельных Божества, так нельзя русского народа — этой святой Тройцы — поделить на три отдельные народа: великороссов, малороссов и белороссов". Далей ён даводзіў, што беларускага народу няма, што гэта выдумка ворагаў „единой неделимой святой Руси". Паводля дакумэнтаў гэта быў бальшавіцкі агент, а паводля зьместу прамовы дык чарнасоценец. Сярод дэлегатаў пачынаецца шум і хваляваньне. Старшыня заклікае да спакою й цярплівасьці. Аратар часта падчыркквае волю Віцебскага Савету Работніцкіх, Сялянскіх і Салдацкіх Дэпутатаў (значa, бальшавіцкае арганізацыі). Тут Тамаш Грыб ня вытрываў ды выгукнуў: „Ура! Поп бальшавік!" Тады прамоўца зыйшоў з трыбуны й падаўся за дзьверы, толькі яго й бачылі.

Групка Беларусаў бальшавізуючых на Кангрэсе ня выступала із сваймі патрабаваньнямі. На лідара яе выглядаў Жылуновіч. Калі аднаго разу выступалі ўсе лідары із сваймі праграмамі-запатрабаваньнямі, дык Жылуновіч на паседжаньне не зьявіўся, а ўважаны за ягонага заступніка Фальскі адмовіўся выступаць з прамовай, бо яму трэ было рыхтаваць хор да канцэрту, ды перадаў справу Шантыру, а Шантыр адмовіўся выступаць быццам дзеля таго, што позна быў паведамлены й ня быў гатовы.

На Кангрэсе была невялікая група чалавек да дваццацёх із Смаленшчыны. Дзядзькі былі паджылыя, апранутыя проста ў кажухі. Яны трымаліся спакойна і ўбаку, з абласьнікамі ня лучыліся. Ад места Смаленску было восем асобаў, а іншыя ад земства. Як я пераканаўся ў вапошнюю бурную ноч, яны былі зацятымі варагамі бальшавікоў і актыўна змагаліся супраць іх.

У Менску было ўжо тады згуртаваньне беларускае моладзі ў „Вучнёўскую Грамаду", якая мела свайго прадстаўніка на Кангрэсе. Вучнёўская Грамада выступала з хорам і дэклямацыяй. За час працы Кангрэсу было дадзена колькі беларускіх канцэртаў для дэлегатаў Кангрэсу. Гэтыя канцэрты былі жывой беларускай прапагандай. Бальшыня дэлегатаў ня бачыла беларускай мастацкай літаратуры й ня чула беларускага мастацкага слова. І вось гэтае жывое мастацкае слова захапляла гледача й несла яго ў новы адроджаны сьвет, адначасна даўно знаёмы яму й блізкі. З дэклямацыяй выходзіла маленькая дзяўчынка В. Г-к, дэклямавала патрыятычныя вершы Янкі Купалы: „Прарок", „Над Нёмнам", „Ворагам беларушчыны" й іншыя. Гэтыя вершы западалі ў душу ды надавалі чалавеку сілы й адвагі на змаганьне за волю, за права нацыі на сваю незалежнасьць, за вызваленьне спад чужацкае няволі, клікалі да помсты за зьдзек і векавечную крыўду. Гэтыя канцэрты далі больш, як палкія прамовы найлепшых прамоўцаў. Тут выходзіў і хор пад кіраўніцтвам Фальскага. Тут дэманстравалі работнікі, як яны будуць будаваць хвабрыкі й машыны для краю, сяляне — як яны будуць паляпшаць зямлю й здабываць больш прадуктаў для краю й на экспарт, транспартнікі дэманстравалі, як яны будуць будаваць дарогі й перавозіць тавары; матросы абяцалі пабудаваць флёту на нашых рэках — Дняпры, Прыпяці, Дзьвіне й Нёмне — ды перавозіць тавары. Усе дэманстравалі асновы незалежнасьці й самастойнасьці Беларусі.

Кангрэс падыходзіў да канца. Правадыры Кангрэсу рыхтаваліся на 17 сьнежня (старога стылю) абвесьціць Беларусь сама-

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

прагналі, але каб і самі адтуль не вярнуліся".

Насталі дваццатыя гады. Сяляне зямлю дзеляць, але бачаць бальшавікоў часовымі гасьцьмі. Моладзь туляецца па кустох, па балотах, а ў бальшавіцкае войска ня хоча йсьці служыць. Хлопцы варочаюцца зь лесу ці з загранiцы. Валасныя камісары (мясцовыя бальшавікі) бяруць іх на вайсковы ўлік (ведама, за хабар), і даюць ім дакуманты, што быццам яны служылі ў чырвонай арміі й пры гэтым дадаюць: „Зь людзьмі трэба жыць пасуседзку". Усе думаюць, што бальшавікі часовыя госьці. А ў народзе ходзяць упартыя чуткі, што бальшавікі неўзабаве адыйдуць за Смаленск і за Стары Дуб. Смаленск блізу ўсе ведаюць, а Старога Дуба ня ведаюць. То там, то сям які стары селянін ці баба, як-бы ні з таго, ні зь сяго, няўзнаку пытае: „А гдзе-ж гэта той Стары Дуб? Кажуць-жа, што бальшавікі адступяць за Смаленска й за Стары Дуб".

Насталі страшныя 1930 і 1931 гады, гады „суцэльнай калектывізацыі". Адны пайшлі ў калгас, а другія не. Але ўзноў, хоць пад строгай канспірацыяй гавораць, што бальшавікі адойдуць за Смаленск і за Стары Дуб, а Палякі за Брэсьць Літоўскі й Беласток. А Беларусь будзе сама сабой. Ужо не Забраны Край, але Беларусь. Калі я пасьля колькіх гадоў адлучкі, улетку 1931 году прыехаў на колькі дзён у сваю вёску, дык адзін стары селянін заклікае мяне ў сваю хату. Калі мы ўвайшлі ў сенцы, дык ён сенцы засунуў засаўкай. Увайшоўшы ў хату, пасадзіў мяне й папярэдзіў, што мае мне пахваліцца цікавай навінай. Ён мне паўшэптам сказаў, што ў хуткім часе бальшавікі адыйдуць за Смаленск і за Стары Дуб, а Беларусь будзе сама сабой. Я ўсьміхнуўся й пытаю: „Хто-ж гэта вас будзе вызваляць ад бальшавікоў?" — „Амэрыка, — адказвае ён — хіба-ж сам ня чуў, што яны даказваюць на Амэрыку? А за што гэта? Бо Амэрыка загадала ім пакінуць Беларусь". Я яму нічога пэўнага не сказаў. Пасьля спатыкаю маладога селяніна, які збольшага і ў палітыцы разьбіраецца. Ён таксама пачынае зы мной гутарку наконт Амэрыкі, што быццам Амэрыка мае Беларусь вызваляць ад бальшавікоў. Я яго добра знаў і сказаў яму свае пагляды: што Амэрыка войска ня мае, і што яна ня хоча ўмешвацца ў эўрапэйскія справы. — „Чаго-ж яны і ў газэтах і на мітынгах гэтак лаюць Амэрыку? У нас усе кажуць, што яны за тое й лаюць Амэрыку, што яна загадала бальшавіком пакінуць Беларусь" — адказаў мой знаёмы.

Па чатырох гадох я зноў зьяўляюся ў сваёй вёсцы. Тут ізноў гутарка аб вайне й вызваленьні Беларусі ад бальшавікоў. Гэта мне кажуць блізкія сваякі. Я, жартуючы, пытаю: „Хто-ж вас гэта будзе вызваляць, ці не Палякі толькі?" А яны: „Куды там прысьпелі Палякі! Гэта Немцы пойдуць супраць бальшавікоў. Гэта весткі з загранiцы. Нябось, людзі ведаюць. Кажуць, што й на граніцы стаяць не Палякі, а Немцы. Ды навет і ў бальшавіцкай газэце было, што на нейкім вялікім зборы Немец уступіўся за Беларусь, што бальшавікі самавольна захапілі Беларусь ды зьдзекуюцца з нашага народу". І гэтая вера ў нямецкае вызваленьне расла й пашыралася ўсьцяж аж да самай вайны 1941 году. І з гэтай верай у нямецкае вызваленьне Беларусі спад бальшавіцкага ярма беларускія масы спатыкалі Немцаў у 1941 годзе з хлебам-сольлю ды з кветкамі.

Якая-ж прычына дапамагала пашыраць думку сярод беларускіх народных масаў, што Амэрыка мае іх вызваліць ад маскоўскай тыраніі? Гэтаму было дзьве прычыны: адно, што нашым людзям думалася, калі амэрыканскі народ волялюбны, культурны й багаты, дык ён павінен выступіць на абарону пакрыўджанага беларускага народу, другое: паколькі бальшавікі вядуць шалёную прапаганду супраць Амэрыканцаў, дык Амэрыканцы варагі бальшавіком; а калі варагі бальшавіком, дык прыяцелі Беларусам.

Што-ж дало веру беларускаму народу, што Немцы іхныя абаронцы ад бальшавіцкага зьверства? Стала аж зашмат толькі тэй фразы, што сказаў нямецкі прадстаўнік у Лізе Нацыяў публічна на ўвесь сьвет, што беларускі народ пакутуе пад бальшавіцкай няволяй, што ён павінен быць вольны. А яшчэ да гэтага бальшавіцкая прапаганда супраць Немцаў запэўніла наш народ, што Немцы на самай справе шчыра жадаюць нашага вызваленьня ад бальшавіцкай тыраніі.

Цяпер у нас ніхто на Беларусі ня быў, і ніхто дакладна ня ведае настрою нашых беларускіх масаў там на Бацькаўшчыне. Аб гэтым мы можам толькі здагадавацца. Аб тым, што беларускі народ варожа настроены супраць Масквы, мы маем дзьве перадумовы: адна, што бальшавікі страшна экспляатуюць наш народ і дэпартуюць у бязьлюдныя пусткі на пэўную сьмерць; другая, шалёная бальшавіцкая прапаганда супраць Амэрыканцаў дае падставу толькі падазрона спадзявацца на прыхільнасьць да нас Амэрыканцаў. Але, *на вялікі жаль, што мы ня гулі ні ад амэрыканскіх навукоўцаў, ні ад выдатных палітыкаў,* што амэрыканскі народ жадае беларускаму народу *волі й незалежнасьці,* як тое некалі сказаў нямецкі прадстаўнік у Лізе Нацыяў . . .

Зебінскі

ПАЎТАРЭНЬНЕ НЭП'У?...

Заканчэньне

Добрую псыхалягічную практыку маюць савецкія заправілы з часоў зганяньня людзей у калгасы. Фактам-жа ёсьць, што ўскочыўшы ў калгас, ды пабачыўшы ўвесь жах і бязраднасьць свайго жыцьця, людзі з такой лютай нянавісьцяй ставіліся да сваіх былых сяброў і навет сваякоў, якія не пайшлі ў калгас, што бальшавіцкія партыйнікі памысна выкарыстоўвалі гэтых калгасьнікаў дзеля зьнішчэньня супраціўнікаў калгасаў. Трэба прызнаць, што бальшавіцкія верхаводы маюць добрых дараднікаў спэцаў-псыхалёгаў, якія давучаць, як выклікаць у масавага жыхарства рунку яны вядуць цяпер палітыку.

пэўную псыхалягічную рэакцыю, патрэбную бальшавіком, каб выкарыстаць гэта на падбой сваіх супраціўнікаў.

Вольнаму сьвету і ўсім супраціўнікам бальшавізму найперш трэба мець на памяці, што нельга спрычыняцца да ўтвар;ньня такога маральнага стану, каб эмігранты самахоць варачаліся дадому, ня лічачыся з тым, што іх спаткае жорсткая кара, або каб падсавецкі жыхар, зьняверыўшыся ў памогу вольнага сьвету, з зацятаю злосьцяю чакаў мамэнту на помсту. А дзеля гэтага рэакцыя на бальшавіцкія палітычна - псыхалягічныя ходаньні павінна быць інакшая. Цешыцца зусім няма з чаго.

С. Міхалеўскі

стойным і незалежным гаспадарствам, якім будзе кіраваць сам беларускі народ. Гэтае паседжаньне меліся зрабіць урачыста ў Менскім тэатры. Але вось новая бяда. Згодна бальшавіцкага апошняга закону, зямля — сялянам, хвабрыкі — работнікам, а тэатр — артыстым. У гэтым часе ў Менску засталася нейкая расейская прыфрантовая трупа. Менскі тэатр стаўся ейнай собінай. Прэзыдыюм ня мог адваяваць памешканьня тэатру на гэта ўрачыстае паседжаньне. Калі туды пайшла група матросаў і салдатаў, дык там яны напаткалі новую правакацыю. Збоку ў тэатры стаяў стол, а ля стала маладая стрыжаная жанчына. Гэта была ўсім ведамая эсэраўка Юр'ева, дэлегатка Кангрэсу ад абласьнікоў. Яна абменьвала чырвоныя мандаты дэлегатаў Кангрэсу на белыя. Чырвоныя мандаты мелі правадзейныя дэлегаты, сінія — дэлегаты з дарадным голасам, а белыя — госьці. Юр'ева забірала мандаты ў дэлегатаў, а выдавала ім білеты на праезд чыгункай дахаты. Матрос Муха папытаўся, на чыё распараджэньне выконвае яна гэтую работу, але Юр'ева не дала адказу. Тады матрос перавярнуў столік, сказаўшы: „Зачыні сваю краму". Юр'ева выхапіла спад крыса пісталет, але страляць не адважылася. Пад агульны сьмех яна пазьбірала паперы ды выйшла.

Для ўрачыстага паседжаньня тэатру не ўдалося дастаць. Старшыня Кангрэсу др. І. Серада супакоіў дэлегатаў, што і ў доме шляхоцкага збору яно будзе ня менш важным, што мęсца паседжаньня Кангрэсу ня зьменіць ягонае гістарычнае вартасьці.

Пленарнае паседжаньне пачалося 17 сьнежня надвечар. На гэтым паседжаньні меліся абгаварыць і прыняць найважнейшыя пастановы аб будучыні Беларусі. Сьпярша выступалі некаторыя дэлегаты як-бы з уступнымі прамовамі ды падчыркvалі важнасьць надыходзячага гістарычнага мамэнту. Аж унеспадзеўкі падыходзіць да прэзыдыюму нейкі высокі чарнамазы з кудлатымі валасамі ў салдацкім шынялі й просіць у прэзыдыюму слова для прывітаньня Кангрэсу. Ён сябе назваў камандантам места Менску, але дакумэнтаў не паказаў. Прэзыдыюм пачаў адмаўляць у ягонай просьбе. Адзін дэлегат ад абласьнікоў, Жыд з паходжаньня, у чыне прапаршчыка, сказаў, што знае гэтага чалавека, што гэта камандант места Менску Крывашэін. Тады прэзыдыюм даў таму слова для прывітаньня. Крывашэін гаварыў доўга, але бяз сэнсу й бязь зьместу, паўтараючыся ды зайкаючыся. Дэлегаты пачалі хвалявацца. Пачуліся галасы: „Гнаць п'яніцу з трыбуны". Калі прэзыдыюм пачаў настойліва прасіць яго зыйсьці з трыбуны, дык ён загаманіў: „Аб'яўляю сход зачыненым. Таварышы, разыйдзецеся!" Хто-ж гэта такі Крывашэін? Аб ім мянчукі расказвалі, што ў часе вайны ён служыў у нейкім транспарце і бадай штодня можна было спаткаць яго на Ніжнім Рынку штоколечы прадаючы: то папонку з каня, то рэмень, то якую салдацкую вопратку.

Захоўваньне Крывашэіна абурыла дэлегатаў Кангрэсу. Пад буру выкрыкаў і сьвістаў Крывашэін пакідае трыбуну ды йдзе за дзьверы. Дэлегаты наракаюць на прэзыдыюм, што пушчае на трыбуну розных прыблудаў ды траціць дарагі час, які трэба выкарыстаць для нацыянальнае справы.

Калі заля супакоілася ды Кангрэс ізноў пачаў працу, дзьверы рашчыняюцца насьцеж і ў залю ўрываюцца чырвонагвардзейцы на чале із сваім начальнікам Рэмнёвым. Яны раптам займаюць праходы, абкружаюць прэзыдыюм, арыштоўваюць яго й выводзяць за дзьверы. Крывашэін і Рэмнёў уважалі, што гэтым сваім брутальным актам яны разьвязалі Усебеларускі Кангрэс. Але дэлегаты ў залі не ўдаліся ў роспач і безнадзейнасьць. Яны выбіраюць новы прэзыдыюм і выносяць пратэст супраць гвалту над абраньнікамі беларускага народу. Праца Кангрэсу йдзе далей. Першым чынам прыцягваецца да адказнасьці той прапаршчык, што зарэкамэндаваў Крывашэіна. Гэты, відаць хочучы паказаць, што ён памыліўся, а ня меў злога намеру, ускоквае на стол да прэзыдыюму, разрывае сваю вайскоўку разам з кашуляй ды стаіць на стале з голымі грудзьмі й жыватом.

Прыйшла вестка, што йзноў ідуць у памешканьне Кангрэсу Крывашэінцы. Дэлегаты стоўпіліся ў дзьвярох, каб ня пусьціць іх у залю. Яны ўсёж прабіваюцца. Прэзыдыюм не сядзіць, а стаіць на сталох. Дэлегаты перад ім вомірг будуюць барыкады з крэслаў. Калі крывашэінцы пачынаюць разьбіраць гэтыя барыкады, дык ім праз галовы лятуць крэслы і вомірг вырастае новая, яшчэ большая барыкада. Крывашэінцы зьмяшаліся з дэлегатамі Кангрэсу. Яны патрабуюць, каб дэлегаты разыходзіліся. Але дэлегатаў было больш, і па нейкім часе выявілася, што частка крывашэінцаў была раззброеная. Крывашэінцы прапанавалі дэлегатам зьвярнуць ім стрэльбы й абяцалі выйсьці. Ім стрэльбы аддалі, і яны выйшлі. Гэ-

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

КАМПАНІЯ „ПАЧКІ НА БЕЛАРУСЬ"

Невыстачальнае разуменьне падсавецкай запраўднасьці Заходнім сьветам пачало ад нейкага часу шырыцца й на эміграцыю паняволеных Масквоў народаў. Падатным грунтам Савецкай яўнай і замаскаванай прапаганды сталася тут дабраднае жаданьне раскіданых па сьвеце людзей аднавіць сувязь із сваймі сваякамі й знаёмымі на Бацькаўшчыне ды чым мага дапамагчы ім. На гэтым груньце выросла ды набывае ўсё большых памераў г. зв. кампанія „пачкі у СССР", якая апошнім часам перайшла проста ў нейкі пачковы псыхоз ды прыцягнула ўвагу амэрыканскай прэсы, грамадзкіх ды урадовых установаў.

Ёсьць тры асноўныя мамэнты ў шкоднасьці пачковае акцыі, што апошнім часам шырыцца й між беларускай эміграцыі ў Амэрыцы.

Першае: „пачковая кампанія" — гэта капальня золата для бальшавікоў" — цьвердзяць амэрыканскія газэты, падаючы факты, як Масква інкасуе ў Амэрыцы вялікія сумы даляраў за высыланыя пачкі. Кажная фірма, што займаецца высыланьнем пачкаў, мусіць мець дазвол ня толькі амэрыканскага, але й савецкага ўраду. Грошы, што бяруцца за пасылкі, ўдвая большыя за кошты перасыланьня іх, складаюцца ў банках на савецкія конты. Гэтай акцыяй, як выявілі падрахункі, савецкі ўрад выцягвае цяпер з Амэрыкі й амэрыканскіх грамадзянаў мільёны даляраў. Гэтыя сумы далёка перавышаюць тыя, што шантажом, пагрозамі, забойствамі ды ліквідацыяй сваякоў у Кітаі здолелі здабыць сваім часам кітайскія бальшавікі ад амэрыканскіх Кітайцаў.

Калі-б савецкі ўрад запраўды хацеў-бы адкрыць шлях амэрыканскай дапамогі падсавецкаму жыхарству, ён мог-бы даўно зьвязацца з амэрыканскімі памаговымі арганізацыямі, што перасылаюць хаця-б папулярныя „КЭЙР"-пакеты". Ды не дапамога падсавецкаму жыхарству мэта пасылковае кампаніі, а першым чынам — грошы савецкай дыктатуры на ейную шпіёнскую й дывэрсійную работу.

Другое, высылаючы пачкі, ды навет лісты, мы даём бальшавіком у рукі адрасы нашых сваякоў і знаёмых на Бацькаўшчыне. Даём МВД довады кантакту нашых блізкіх з вольным сьветам, із сваякамі ў Амэрыцы, ды гэтым здаём блізкіх нам людзей на поўную ласку й няласку таго МВД. Мы нек забываемся, што кажная анкета пры паступленьні на працу ў Саветах мае пытаньне — ці маеце сваякоў за межамі і ў якой краіне? Забываемся, што нат пры першым нявінным пакліканьні ў міліцыю ці МВД пытаньне аб сваякох за межамі будзе пастаўленае із спэцыяльным націскам, а пры нагодным арышце пытаньне гэтае вырасьце ў вабвінавачаньне ў шпіянажы на карысьць Амэрыкі ці іншага краю вольнага сьвету. Забываемся аб існаваньні МВД, спэцаддзелаў, шпікоў, сэксотаў, дзе ні павярніся, аб нячуваным тэрары допытаў, пры якіх нат валаты духу прызнаюцца да такіх злачынстваў, якіх ім ніколі й ня сьнілася рабіць. Насуперак лёгіцы, хочам забыцца аб гэтым, хаця бадай штодня спатыкаемся зь людзьмі, сон якіх і сяньня сутаргі трывожаць, якія мелі нагоду пабываць у сьценах бальшавіцкіх катоўняў . . .

Чытаем у газэтах аб шораз новых і бязупынных высылках на „асваеньне цалінных земляў" Сібіру, Казахстану, Караганды. Ведаем, што гэтую дармавую рабочую сілу даюць Маскве калёніі паняволеных народаў, а ў тым ліку й Беларусь, што рост ваеннай гатовасьці СССР вымагае й будзе вымагаць надалей усё болей і болей гэтае дармавое рабочае сілы зьняволеных, што гоняць на падобныя катаржныя работы першым чынам „узятых на учот МВД", што шмат нашых сваякоў і знаёмых прайшло ды праходзяць гэтым гістарычным крывавым шляхам Беларусь-Сібір . . . Чамусьці нам здаецца, што пры наступных кампаніях вывазаў нашых знаёмых нек уважаць і будуць абмінаць . . .

Трэйцяе, высылаючы пачкі й лісты мы даём у бальшавіцкія рукі нашыя адрасы, а гэтым — магчымасьць іхным органам прапаганды „звароту на Радзіму" ды розным іншым замаскаваным органам пятае калёны дзеіць на нас. Праўда, на адрасы шмат якіх эмігрантаў тымчасам шлюць толькі літаратуру — „вяртайся на Радзіму" — беспасярэдня з савецкіх установаў. Аднак, ёсьць ужо й выпадкі, што шлюць гэтую літаратуру з адрасоў людзей, якія жывуць у вольным сьвеце, бязь іхнага ведама, згоды ды на вялікае іхнае зьдзіўленьне, і на падступам здабытыя адрасы іншых эмігрантаў. Але ці-ж на гэтым канец... Мазгі бальшавіцкае прапаганды дый МВД працуюць і бязупынна выдумляюць усё новыя мэтады ўзьдзеяньня на эміграцыю, каб заламаць яе духова ды спараліжаваць ейную дзейнасьць. Кажны дзень нясе нам і, трэба думаць, будзе несьці новыя неспадзеўкі. Да канца яшчэ далёка...

І тутака нас вельмі дзівіць тое, што канадзкі „Беларускі голас" (дарэчы, аднайменьнік расейскага, польскага ды ўкраінскага „галасоў", што выходзяць у Амэрыцы) ахвоча папулярызуе справу высыланьня пачкаў у СССР, адводзячы на гэта палавіну, а то й больш, балоны кажнага свайго нумару . . .

Мы добра ўсьведамляем сабе, што эмігранты, высылаючы пачкі сваім сваяком і знаёмым у СССР, кіруюцца найлепшымі людзкімі пачуцьцямі памагчы тым, хто гэтай дапамогі напэўна патрабуе. Трэба аднак добра перадумаць, каб нашая сьціплая дапамога, безь якой нашыя знаёмыя абыходзіліся дагэтуль, ня сталася прычынай непараўнальна большай шкоды і ім і нам . . .

К. Сурбін

У МОЛАДЗІ

На зборцы 15 чырвеня сёлета Згуртаваньне Беларускае Моладзі ў Нью Ёрку закончыла зімовы сэзон свае працы.

Кіраўнік моладзі сп. М. Казьлякоўскі пералічыў важнейшыя дасягненьні ў працы моладзі Нью Ёрку за час ад восені да лета. Такімі дасягненьнямі былі:

Актыўны ўдзел у 4-ым Зьезьдзе ЗБМА ў Нью Брансўіку;

Сыстэматычныя зборкі моладзі ў YWCA што пятніцы;

Рэфэраты ладжаныя для моладзі культурна-асьветным рэфэрэнтам Акругі БАЗА ў Нью Ёрку;

Змаганьні футбольнай дружыны „Беларусь" у амэрыканскай спартовай лізе;

Удзел у хоры, індывідуальныя выступы сябровак Згуртаваньня ды выступы танцавальнага гуртка моладзі на беларускіх нацыявальных імпрэзах у Нью Ёрку;

Удзел у міжнацыянальным фэстывалю, ладжаным Амэрыканскімі Вэтэранамі вамежных войнаў з нагоды Дня Ляяльнасьці;

Зладжаньне вечару ялінкі й „Дня Удзячнасьці" для моладзі;

Зладжаньне восенскага й веснавога баляў;

Зарганізаваньне канцэрту хору „Жалейка" ў Нью Ёрку й прыняцьця гасьцей із Канады;

Кіраўнік дзякаваў моладзі за супрацоўніцтва й вялікую працу, якую моладзь прарабіла за мінулы сэзон.

У летні час Аддзел ЗБМА ў Нью Ёрку плянуе ладзіць экскурсіі й узяць удзел у спатканьні Беларусаў Амэрыкі й Канады ў Торонта.

Сябра ЗБМА

та падтрымала нас на духу. Ізноў пратэстуем, але прэзыдыюм стаіць на сталох, а барыкады неразабраныя.

Крывашэінскае начальства, выклікаўшы на вуліцу сваіх гвардзейцаў, дало ім вымову за кепскае дзеяньне ды, падмацаваўшы новымі сіламі, ізноў загадала разганяць Кангрэс. Гэтым разам яны не мяшаюцца з дэлегатамі Кангрэсу, а імкнуцца абкружыць іх. Рабілі спробы дабрацца да прэзыдыюму, але дэлегаты зграмадзіліся каля барыкадаў і не дапусьцілі іх туды. Калі крывашэінскія салдаты занадта накідаліся на дэлегатаў, дык дэлегаты пяялі рэвалюцыйныя песьні. Гэта асаджвала крывашэінцаў. У вадным месцы раптам ушчынаецца валтузьня, а ў сяродку яе ўзьнімаецца ўгару рука зь пісталетам і насупраць яе дзьве рукі яшчэ. Гэта капітан Н., што хадзіў у пагонах, заспрачаўся з крывашэінскім камісарам. Камісар узьняў на яго пісталет, але натоўп дэлегатаў аднёс капітана ўбок.

Валтузьня цягнулася ўсю ноч. Бальшавікі лагадней абыходзіліся з тымі дэлегатамі, што былі ў простым салдацкім убраньні. Мне была нагода больш за іншых агрызацца з крывашэінцамі, што мой шынэль быў просты, пацёрты ды яшчэ ўдадатак рукаво й крысо былі апаленыя ў часе падарожжа на Кангрэс. Гэта быў рачовы довад, што я франтавік. Нарэшце, бальшавікі прыдумалі новы мэтад высяленьня дэлегатаў з памешканьня: яны папарадку ад дзьвярэй бралі па два дэлегаты й выводзілі іх на вуліцу ды там пакідалі. Гэтак за ноч яны здолелі выселіць Кангрэс з памешканьня. Пры высяленьні мая радоўка была ў ліку апошніх. Я выйшаў у ваднэй пары з Мамонькам.

Пасьля гэтага я не пайшоў начаваць на Брэскі вакзал у санітарныя вагоны, але пайшоў на Старажоўку шукаць кватэры свайго знаёмага. Ужо досьвіткам я прыйшоў да яго. Трохі спачыўшы, раніцой я пайшоў на Пляц Волі, дзе ў б. губарнатарскім доме зьмяшчаліся Вялікая Беларуская Рада й Беларуская Вайсковая Рада, аж там пры дзьвярох пабачыў бальшавіцкую варту. Прахаджаючыся па пляцы, я спаткаў свайго знаёмага, дэлегата Кангрэсу, які паведаміў мне, што правадыры Кангрэсу — др. Серада, Езавітаў, Прушынскі ды іншыя — усе жывыя й на волі, што ў часе разгону Кангрэсу другі бальшавіцкі аддзел зрабіў налёт на гасподу Вялікае Беларускай Рады й Вайсковай Рады (б. дом губарнатара), забралі Беларусаў, што там жылі ды ўсе іхныя рэчы й перавезьлі на Захараўскую вуліцу ў дом Настаўніцкага Інстытуту (пасьля Беларускі Пэдагагічны Тэхнікум), а гэтае памешканьне абставілі сваёй вартай. І яшчэ ён мне сказаў, што і мне і іншым дэлегатам Кангрэсу трэба наведаць новае памешканьне Вялікае Беларускае Рады на Захараўскай вуліцы й атрымаць патрэбныя даведкі. Там я пабачыў шмат знаёмых і кіраўнікоў Кангрэсу, там мне далі адрыс чыгуначнага клюбу Лібава-Роменскай чыгункі, дзе будуць адбывацца далейшыя паседжаньні Кангрэсу.

31 сьнежня (18 сьнежня ст. ст.) папаўдні пачалося чароднае паседжаньне Кангрэсу. Першым чынам аформілі пратэст супраць нячуванага бальшавіцкага гвалту над прадстаўнікамі беларускага народу. Пасьля Кангрэс вынес рад пастановаў аб арганізацыі ўлады на Беларусі. Тут-жа Кангрэс вылучыў Выканальны Камітэт і Раду Ўсебеларускага Кангрэсу, якія будуць рэпрэзэнтаваць беларускі народ аж да часу скліканьня Устаноўнага Сойму на вольнай Беларускай Зямлі, якому й зложа свае паўнамоцтвы. Гэтаму выканальнаму воргану было даручана арганізаваць уладу на Беларусі: паклікаць, кааптаваць і ўпаўнаважваць адпаведных да гэтае справы людзей, складаць урады й рады ды праводзіць выбары ў Устаноўны Сойм.

Калі дэлегаты Кангрэсу з усёй сваёй энэргіяй заняліся гэтаю працай, у памешканьне ўвайшлі тры маладыя хлапцы, якія назваліся „Камісарамі Западной Области". Гэта былі Ляндэр, Рэзаўскі й Мясьнікоў. Яны патрабавалі ад чыгуначнікаў выселіць Усебеларускі Кангрэс з памешканьня чыгункі. Тут узьнімаецца таўсты голены дзядзька, бліснуў акулярамі й загаманіў: „Пашлі вон, мярзаўцы!" Калі яны хацелі нешта сказаць у сваю абарону, дык ён дадаў: „Хутчэй выбірайцеся, каб вашага тут і смуроду ня было! Калі будзеце больш назаляцца, дык за два дні будзе спынены рух па ўсіх чыгунках". Камісары паціснулі за дзьверы. Дэлегаты да вечара скончылі сваю працу й разьехаліся. У Менску застаўся Выканальны Камітэт Усебеларускага Кангрэсу. Гэты выканальны камітэт Усебеларускага Кангрэсу папоўніўшы свае рады новымі дастойнымі людзьмі ды прыняўшы назоў Рады Беларускае Народнае Рэспублікі, абвесьціў Акт 25 Сакавіка і ўтварыў урад Беларускай Народнай Рэспублікі, што пражыў на эміграцыі да нашых дзён і цяпер рэпрэзэнтуе беларускі народ у вольным сьвеце.

Дэлегат Кангрэсу

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Канцэрт хору „Жалейка"

19 мая сёлета адбыўся ў Нью Ёрку канцэрт беларускага мужчынскага хору „ЖАЛЕЙКА" з Монтрэалю — Канада.

На канцэрт прыбыло шмат Беларусаў зь Нью Ёрку й ваколіцаў, бо ўжо раней шмат хто чуў аб мастацкіх выступах „Жалейкі" ды кружэлкі гэтага хору, што хетась выйшлі ў Амэрыцы, паддзержвалі цікавасьць паслухаць выступ самога хору.

І запраўды, усе спадзяваньні цалкам апраўдаліся. Хор даў канцэрт на высокім мастацкім узроўні. Дырыгент яго сп. І. Казачок паказаў надзвычайныя ўмеласьці ў кіраваньні хорам ды ў выяўленьні таго, зь якім мастацтвам можа быць выкананая беларуская песьня. Відаць было, колькі сыстэматычнае й даўгое працы ўклалі ў рыхтаваньне канцэрту ўсе ўдзельнікі хору „Жалейка".

Канцэрт складаўся з 2-х частак. У першай хор выканаў песьні гарманізацыі М. Равенскага — „Пагоню", „Вечарком" і „Халімон"; гарманізацыі А. Карповіча — „Цераз сад-вінаград", „Лапці", „Бульба", „На выгнаньні" і „Зважай"; апрацаваньня Тэраўскага — „Калініца" і ўкраінскую народную песьню „Та баляць ручкі". У другой частцы хор выканаў у вапрацаваньні А. Карповіча — „У садзе гуляла" і „Партызанскі марш"; у вапрацаваньні Валынчыка „Вось і паў ужо змрок"; у вапрацаваньні М. Куліковіча — „Марш Моладзі", „Я ад вас далёка" і „Час"; „Возера сьніць" і „Сэрэнаду".

Арганізатарам, душою й найактыўнейшым удзельнікам канцэрту быў спадар П. Чопчыц. Ён зарганізаваў прыезд хору ў Нью Ёрк, а ў праграме канцэрту ўдала пяяў солё „Калядная ночка", муз. Хацкай, „Каханая, ня плач па шчасьці" і „Зьнічка" муз. А. Карповіча, ды „Сам ня знаю, ня ведаю" муз. Туранкова. Чуласьць свае душы й вялікую любоў да беларускага слова й песьні, хаця часамі й перачуленасьць, выявіў ён у ўступным слове й дэклямацыі „Цару Неба й зямлі" Янкі Купалы.

Заслугоўвалі на ўвагу й скокі сёстраў Д. і Т. Грыньковых — „Вальс", камічны танец „Полька" і Цыганскі танец". Хаця ўсе скокі былі добра выкананыя, дык аднак кідалася ў вочы недапасаванасьць гэтых скокаў да нацыянальнага характару выступу хору „Жалейка".

Сп-ня Г. Словач удала акампаніявала да ўсіх песень хору й салёвых выступаў. Пад музыку яе выконваліся таксама й танцы сёстраў Грыньковых.

Канцэрт закончыўся вельмі ўрачыста рэлігійным гімнам „Магутны Божа" пры інсцэнізацыі „Вызваленьне Беларусі".

Пасьля канцэрту адбылося прыняцьце, якое зладзілі гасьцём із Монтрэалю беларускія арганізацыі Нью Ёрку. Шмат хто выказваў падзяку за прыбыцьцё ў Нью Ёрк, задаваленьне й найлепшыя пажаданьні дырыгенту й ўсім удзельнікам хору „Жалейка".

Гэткі-ж канцэрт паўтарыўся з таксама добрым вынікам 20 траўня ў Саўт Рывэры.

Арганізацыйную працу для зладжаньня канцэрту хору „Жалейка" належна правяло Згуртаваньне Беларускае Моладзі ў Нью Ёрку. Найбольш аднак зрабілі для зладжаньня вечару кіраўнік моладзі сп. М. Казьлякоўскі й сябра В. Станкевіч.

НЯВОЛЬНІКІ ЗЬ БЕЛАРУСІ Ў КАЗАХСТАН

Камуністычная украінская газэта „Українські Щоденні Вісті" за 3 чырвеня 1956 г. зьмясьціла гэткую зацемку: *Беларуская моладзь на работу ў Казахстане. Гонконг, 30 травеня. Пекінскае радыё паведаміла ўчора, што 2000 беларускіх юнакоў будзе працаваць у ліпені на будове новае чыгункі між Казахскаю ССР і Кітаем.*

Вестка з жаролаў камуністычных, дык, пэўне-ж, сапраўдная. Камэнтараў да гэтага ня трэба.

ПАУСТАНЬНЕ Ў ПАЗНАНІ

У часе Пазнанскіх Таргоў, на якіх было шмат гасьцей з Захаду, пазнанскія работнікі 28-га чырвеня паднялі бунт супраць бальшавіцкага рэжыму й каляніяльнага вызыску Масквы. Дэманстранты захапілі ратушу, дом кампартыі, радыястанцыю, якая глушыла перадачы з вольнага сьвету ды інш. На ўціхамірaньне дэманстрантаў бальшавіцкі рэжым паклікаў войска, якое пры дапамозе танкаў і машыновай зброі здушвае бунт.

Із спагадай адзначаючы пачын пазнанскіх работнікаў, сяньня яшчэ рана гаварыць, колькі ў гэтым чыне арганізаванага, а колькі стыхійнага імкненьня зьняволеных да волі, ды колькі бальшавіцкай правакацыі.

НАВУКОВЫЯ РЭФЭРАТЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ІНСТЫТУЦЕ НАВУКІ Й МАСТАЦТВА

- 7-га красавіка сёлета гэн. Ф. Кушаль — Грунвальдзкая бітва.
- 21-га красавіка сп. А. Адамовіч — Сучасныя аспэкты сацыялістычнага рэалізму.
- 2-га чырвеня адбылося дыскусійнае паседжаньне на тэму: Спроба навуковага аблічэньня сучаснага ліку Беларусаў у Беларусі й за межамі.
- 16-га чырвеня др. Вітаўт Кіпель — Чацьвярцінны пэрыяд на Беларусі.
- 30-га чырвеня сп. Г. Паланевіч — Інстытут Беларускай Культуры (ІНБЕЛКУЛЬТ).

КАНФЭРЭНЦЫЯ ІНСТЫТУТУ ВЫВУЧЭНЬНЯ СССР

29-га й 30-га красавіка сёлета Інстытут Вывучэньня СССР ладзіў у Нью Ёрку навуковую канфэрэнцыю на тэму: „Савецкі Саюз у 1956 г."

Канфэрэнцыя адбылася ў будынку Фундацыі Карнэгі на пляцы Задзіночаных Нацыяў. Рыхтаваньнем яе займаўся арганізацыйны камітэт у складзе: праф. Ант. Адамовіч (Беларус), праф. М. Ветухіў (Украінец) і праф. А. Філіпаў (Расеец). Адначасна ў памешканьні канфэрэнцыі адбывалася мастацкая выстаўка творчасьці мастакоў-эмігрантаў з СССР ды выстаўка выдавецтваў.

Канфэрэнцыю адчыніў старшыня Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня ад Бальшавізму, сп. Г. Сарджэнт, прадставіўшы слова былому сэнатару ЗША, Уільяму Бэнтану, які зрабіў сваей прамовай добрыя ўводзіны ў працу канфэрэнцыі. У часе канфэрэнцыі былі прачытаныя гэтакія даклады: Аналіз 20-га Партыйнага Зьезду (Н. Ляскоўскі), Савецкая сельскагаспадарская палітыка й нацыянальная праблема ў СССР (В. Цімашэнка), Сучасная савецкая навука (М. Ветухіў), Бягучыя аспэкты „сацыялістычнага рэалізму" (Ант. Адамовіч), Савецкая палітыка ў Азіі (Р. Назар), Манголія й савецкая палітыка на Далёкім Усходзе (Н. Попэ), Савецкая замежная эканамічная палітыка (Дж. Летыш). Пасьля кажнага дакладу была дыскусія.

У мастацкай выстаўцы, арганізаванай праф. С. Лытвынэнкам, узялі удзел: Армяне, Беларусы, Украінцы й Расейцы. Беларускае мастацтва было рэпрэзэнтаванае ведамымі нашымі мастакамі: П. Мірановічам ды А. Раманоўскім. Абразы беларускіх мастакоў здабылі вельмі добрую ацэну амэрыканскіх адведавальнікаў.

Асобны пакой быў прызначаны на выдавецкую выстаўку. Тут былі выстаўленыя выданьні Інстытуту Вывучэньня СССР, расейскага Чэхаўскага Выдавецтва, украінскай Акадэміі Навукаў ды беларускіх выдавецтваў: „Бацькаўшчына", Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва, Крывіцкага Навуковага Таварыства, В-ва „Зьніч" ды В-ва Ул. Пелясы. Трэба адзначыць, што стол зь беларускімі выданьнямі ня суступаў іншым, хаця нашыя магчымасьці выдаваньня вельмі сьціплыя і ў выданьне кажнае кнігі ўкладзена шмат ініцыятывы, грамадзкай і прыватнай ахвярнасьці і безынтэрэсоўнай працы.

Наагул, сёлетняя навуковая канфэрэнцыя Інстытуту Вывучэньня СССР была зарганізавана ўдала, а зладжаная адначасна выстаўка прыцягнула ўвагу шырокага кругу эмігранцкае інтэлігэнцыі паняволеных Масквой народаў.

РЭФЭРАТ ПРА ПАХОДЖАНЬНЕ БЕЛАРУСКАГА НАРОДУ Ў УКРАІНСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК

Праф. Я. Станкевіч меў 9 чырвеня ў Украінскай Акадэміі Навук рэфэрат на тэму „Паходжаньне крывіцкага (беларускага) народу ў сьвятле археалёгічных даных". Лектар паказаў, што да прыходу беларускіх Славянаў на беларускую гістарычную тэрыторыю, яна ўся была занятая Балтамі. Пра гэта сьветчаць старавечныя археалёгічныя памяткі, гарадзішчы й курганы; адныя й другія пакрываюць усю Беларусь. Яны сваёй будоўляю, а курганы пахоўным абрадам, аднолькавыя з такімі-ж памяткамі прашчураў цяперашніх этнаграфічных Балтаў.

Таксама ў дагістарычнай і раньня-гістарычнай Беларусі панавала культура — т. зв. Рагінянская ў IV-VIII стагодзьдзях (культура рэчаў зь медзі й бронзы, з прарэзам і з колернай эмаляй); працягам ейным была культура Мэмэльская (Кляйпэдзкая) IX стг. (эмаль у яе заменена срэбрам) і Люцынская (X стг.), што ў васлабленым стане пашыраная яшчэ ў XI а XII стг.

Як жыхарства ралейнае, Балты засталіся на месцы, й калі прыйшла беларуская частка Славянаў, сталася зьмяшаньне й зьліцьцё беларускіх Балтаў ізь беларускімі Славянамі. Што зараўды гэтак было, сьветчаць балцкія геаграфічныя назовы на Беларусі; іхная тэрыторыя пакрываецца з тэрыторыяй беларускае мовы ў ейных межах да XVII стагодзьдзя ўлучна. Сьветчаць пра гэта таксама балцкія рысы ў беларускай мове — аканьне ў цэлай беларускай мове, паліфтонгі ў ейнай паўдзённай падмове ды мяшаньне ч і ц, замена ж на з і ш на с у паўночнай падмове.

На аснове старых славянска-беларускіх моўных рысаў, супольных усім беларускім дыялектам Я. Станкевіч уважае, што было толькі адно плямя беларускіх Славянаў, затое расклад гэтых балцкіх рысаў на тэрыторыі беларускае мовы сьветча, што беларускія Балты складаліся найменей з двух племяў. Разнапляменны балцкі субстрат беларускага народу быў галоўнай прычынаю падзелу яго на племі ды злучаныя зь імі падмовы.

Будучы ўжо ў васноўным балцка-славянскай сынтэзаю, Беларусы, відавочна, перасяліліся на захад, да Нямеччыны, бо пасьлей, каля восьмага стагодзьдзя, яны стуль прыходзяць на сваю гістарычную бацькаўшчыну. Пра прыход беларускага народу із Захаду сьветчыць вялікі лік віленскіх, віцебскіх, пскоўскіх і інш. курганоў з высокай якасьці зялезнымі рэчамі заходняга тыпу. Пра гэта-ж сьветчаць заходняга тыпу каменныя магілы, знойдзеныя на Беларусі на вялізманай прасторы. У іх знаходзяць урны з рэштками трупаспаленьня і заходнюю высокай якасьці зялезную культуру. Такая-ж зялезная культура ёсьць у найстарэйшым пласьце магільніка ў Гнездаве (на месцы старога Смаленску).

ВЫПІСВАЙЦЕ, ЧЫТАЙЦЕ І ПАШЫРАЙЦЕ ГАЗЭТУ „БЕЛАРУС".

ЛІСТ Ў РЭДАКЦЫЮ

Паважаны Спадару Рэдактару!

Прыемна мне было адзержыць новы нумар „Беларуса". Шкада, што ён рэдка выходзе. Дазвольце падзяліцца мне аднэй думкаю што да „Беларуса". Мне здаецца, што карысна было-б друкаваць ў „Беларусу" лісты чытачоў. Гэтак лягкім спосабам чытачы дзяліліся-б із сабою сваймі паглядамі, жаданьнямі, імкненьнямі, зьявіліся-б новыя ведамкі, узьніклі-б дыскусіі і, дзякуючы ім, шмат цёмных пытаньняў было-б выясьнена. Калі-б Ваша з гэтым згадзіўся, дык надрукуйце, калі ласка, гэты мой ліст. Я хацеў-бы зацеміць тое-сёе празь некаторыя месцы ў вапошнім (55) нумары „Беларуса".

У перадавіцы, між іншага, кажацца празь Беларусаў, што перасяліліся да Польшчы на землі, далучаныя ад Нямеччыны, што „Задзіночаная Нямеччына паставіць пытаньне аб іхным высяленьні". Дапушчаючы гэта падзьдзержваецца вымаганьне Немцаў зьвярнуць ім гэныя землі. А трэба ведаць, што нямецкія дзейнікі ставяць гэтую справу так, каб Польшчы былі зьверненыя беларускія ды ўкраінскія землі па Рыскую мяжу, а Нямеччыне — землі, забраныя ад яе да Польшчы. Ведама, што такое разьвязаньне пытаньня крыўднае нам. Бясспрэчна, вольная, незалежная Беларусь прыйме свае дзеці назад у кожным выпадку.

У зацемцы „Праф. Смаль-Стоцкі пра Вільню" прыводзіцца месца з артыкулу гэтага профэсара, дзе ён кажа, што ў Вільні „скрыжаваньне народаў — Летувісаў, Палякоў, Беларусаў, Жыдоў, Татар". Проф. Смаль-Стоцкі здалёку можа ня ведаць, што Татарамі на Беларусі завуць беларускіх мусульманаў. Іхныя прашчуры „па мячу", зьявіўшыся на Беларусь 500 і болей год таму із розных народаў паўночнага Каўказу й Крыму ды, як палітычныя ўцекачы або палоненыя, без жанок сваіх плямён, ня толькі этнаграфічна, але й з крыві асыміляваліся зь Беларусамі. Што да віленскіх Палякоў, дык із малымі выняткамі яны — спалячаныя Беларусы.

У тэй-жа зацемцы кажацца, што бальшыню навезеных да Вільні Летувісаў пасьлей вывезьлі бальшавікі. Выглядае, што бальшавікі вывозілі адных Летувісаў, прыміж таго яшчэ болей яны вывозілі й вывозяць Беларусаў.

У варт. „Крамлёўскае дышла", кажацца, што „калі-б народы СССР перамаглі той інстынктоўны страх перад дыктатураю ды запатрабавалі сваіх правоў, тады-б толькі бальшавіцкія верхаводы пачуліся-б як на вугальлі. Нажаль, пры наяўнасьці супалкі бальшавізму з расейскім імпэрыялізмам цяжка гэтаму збыцца". Хоць цяжка, але збыцца гэта мусіць, бо ня можам спадзявацца, каб бальшавікі й расейскі імпэрыялізм разадзіночыліся; мусім іх перамагчы задзіночаных. Гісторыя паказала, што Расейцы ў сваёй масе заўсёды згаджаліся з найгоршымі імкненьнямі свае ўлады, пакуль яна была дужая.

У гэтым нумары „Беларуса" вельмі добры артыкул „На сваім полюсе". Такія артыкулы асабліва трэба выдаваць паангельску (не ў „Беларусу"). Шчыра родным павеяла з артыкулу „Сьветчаньні камянёў". Трэба спадзявацца, што гэта пачатак зьвярненьня ўвагі на нашу старую эміграцыю.

Чытач

Ад Рэдакцыі. Перадавы артыкул, аб якім успамінае Чытач, мае выразны сэнс, што Беларусь павінна быць незалежнай у этнаграфічных межах. Праўдападабенства звароту выселеных у Польшчу Беларусаў ды наагул усіх Беларусаў якія захочуць або будуць змушаныя вярнуцца на Бацькаўшчыну, прамаўляе якраз за гэта. Але гэтым мы не паддзержвалі нямецкае стаўленьне справы (а сам Чытач прызнае, што яна ўжо ставіцца). Маўчаньне Беларусаў хутчэй можа спрычыніцца да зьдзейсьненьня нямецкага спосабу разьвязаньня. Зноўжа, калі-б гэтае пытаньне нікім ня ставілася, дык гэта не атушыць польскай прагнасьці да рыскіх межаў. Таму гэтая засьцярога Чытача нам выдаецца няістотнай.

Другая засьцярога, што словы у артыкуле „Крамлёўскае дышла" але гэтаму цяжка збыцца" азначаюць безнадзейнасьць змаганьня з бальшавізмам. Аўтар памянёнага артыкулу разумеў, што пры наяўнасьці супалкі расейскага імпэрыялізму з бальшавізмам цяжка збыцца таму, каб паняволеныя народы СССР вызваліліся сваймі сіламі, прынамся ў блізкім часе. Магчыма, не даволі ясна выказаная гэтая думка. Пэўна-ж гэта кепска, калі й іншыя зразумелі так, як сп. Чытач.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Канфэрэнцыя БАЗА

26 траўня ёлета адбылася ў Нью Ёрку канфэрэнцыя старшыняў аддзелаў і дэлегатураў Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў ЗША.

Канфэрэнцыя, скліканая Галоўнай Управай БАЗА, мела за заданьне разгледзець вынікі дзейнасьці БАЗА за час ад 6-га Кангрэсу БАЗА (28 і 29 траўня 1955 г.) да 26 траўня 1956 г., абмеркаваць важнейшыя арганізацыйныя справы ды выпрацаваць захады дзеля палепшаньня далейшай дзейнасьці БАЗА.

У канфэрэнцыі ўзялі ўдзел, апрача старшыняў аддзелаў і дэлегатураў БАЗА, сябры Галоўнае Управы, Рэвізійная Камісія, адзін із спонсараў БАЗА — сп. др. А. Ворса, ды прадстаўнікі — ад Беларускага Выдавецкага Фонду, Рэдакцыйнай Калегіі газэты „Беларус", Камітэту Набыцьця Беларускага Народнага Дому, Управы Згуртаваньня Беларускіх Жанчынаў у ЗША, Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва, ад Згуртаваньня Беларускае Моладзі ў ЗША ды колькі паасобных сяброў БАЗА.

Канфэрэнцыю вёў старшыня Гал. Управы сп. М. Тулейка, а сакратарыў сп. Ю. Станкевіч.

Найперш Галоўная Управа й Старшыні Аддзелаў і Дэлегатураў БАЗА здалі справаздачы із свае дзейнасьці. Ад няпрыбылых старшыняў былі прачытаныя пісьмовыя справаздачы. Із выказанага было відаць, што Галоўная Управа актыўна дзеіла на працягу цэлага году, утрымвала належны кантакт з усімі асяродкамі БАЗА, выслала 200 „Кэр" пачок і 205 даляраў у Беларускі Нацыянальны Камітэт у Нямеччыне, 60 даляраў Архіепіскапу Сергію ў Аўстраліі і 35 даляраў індывідуальна патрабуючым суродзічам у Эўропе, выстаралася ашурансы для 26 беларускіх сем'яў на пераезд у ЗША, дабілася прызнаньня беларускае нацыянальнасьці пры атрымваньні амэрыканскага грамадзянства, дапамагала некаторым аддзелам ладзіць нацыянальныя імпрэзы, брала ўдзел у канфэрэнцыях і імпрэзах амэрыканскіх ды іншанацыяпальных арганізацыяў.

Аддзелы — Нью Ёрк, Саўт-Рывэр-Нью Брансўік і Кліўленд дасягнулі найбольшых вынікаў у грамадзка-нацыянальнай працы. Меншыя аддзелы выявілі таксама жвавасьць у арганізацыйным жыцьці, асабліва аддзел Стамфорд, які найбольш актыўна дапамагаў у ладжаньні ўсіх імпрэзаў у Нью Ёрку.

У справаздачах і дыскусіі была ўзятая таксама ўвага на нездавальняючую арганізацыйную працу ўправаў аддзелаў ізь сябрамі БАЗА. Канфэрэнцыя вынесла пастанову, каб усе аддзелы й дэлегатуры часьцей ладзілі зборкі сваіх сяброў і розныя грамадзкія ды культурна-асьветныя імпрэзы, — каб усімі спосабамі утрымвалі цясьнейшы кантакт ізь сябрамі БАЗА.

Канфэрэнцыя ўзяла таксама ўвагу на канечнасьць закгывізаваньня культурна-асьветнай працы. Усе аддзелы мусяць мець культурна-асьветных рэфэрэнтаў, а рэфэрэнт Галоўнай Управы павінен выказацца большай руплівасьцяй у кіраваньні культурна-асьветнай працы ў ваддзелах.

На прапанову рэвізійнае камісіі канфэрэнцыя аднагалосна вынесла пастанову аб прызнаньні працы Галоўнае Управы.

Пасьля сп. М. Міцкевіч інфармаваў аб дзейнасьці Беларускага Выдавецкага Фонду й аб выдаваньні газэты „Беларус", сп. К. Мерляк інфармаваў аб дзейнасьці Камітэту набыцьця Беларускага Народнага Дому, сп-ня Н. Кушаль аб дзейнасьці Беларускага Жаноцкага Згуртаваньня, сп. М. Тулейка аб бібліятэцы БАЗА і аб Сёмым Кангрэсе, др. В. Тумаш аб дзейнасьці камісіі арганізаваньня прадстаўніцтва беларускіх арганізацыяў у ЗША. Канфэрэнцыя апрабавала праект статуту Беларускай Кангрэсавай Рады Амэрыкі, як арганізацыйную аснову дзеля зрэалізаваньня пастановы Шостага Кангрэсу БАЗА аб заснаваньні прадстаўніцтва.

Вельмі цікавую інфармацыю аб сваім падарожжы у Эўропу падаў др. А. Вярбіцкі. Ён гаварыў аб нарадзе зь Беларускім Нацыянальным Камітэтам у Нямеччыне, з прадстаўнікамі беларускай сэкцыі радыё „Вызваленьне" і Інстытуту для вывучэньня СССР, із студэнтамі і айцом ван Каўвэляртам у Бэльгіі і аб спаткаьні із прэзыдэнтам Рады БНР, інж. М. Абрамчыкам.

Канфэрэнцыя прыняла прапанову Галоўнай Управы аб наладжаньні экскурсіі ў Канаду дзеля спаткаьня Беларусаў Амэрыкі й Канады. У гэтай вялікай імпрэзе маюць узяць удзел усе аддзелы й дэлегатуры БАЗА.

На прапанову аддзелу БАЗА Спрынгфільд дыскутавалася справа заснаваньня Беларускай Касы Самапомачы. Канфэрэнцыя прызнала патрэбу такой касы, і дзеля зарганізаваньня яе выдзеліла камісію ў складзе сп. сп. др. А. Ворсы, мгр. М. Кунцэвіча, інж. Ч. Ханяўкі.

На прапанову сп. ген. Ф. Кушаля канфэрэнцыя даручыла Галоўнай Управе зьберці сьпісы замучаных бальшавікамі ды дасюль церпячых і зьняволеных Беларусаў у СССР ды пераслаць гэтыя сьпісы арганізацыям і ўплывовым палітыкам дэмакратычных краёў з просьбай, каб яны дапамаглі выратаваць яшчэ жывых, і каб лік памерлых даў ім уяўленьне аб народагубсьцьве на Беларусі.

У канцы канфэрэнцыі адбыўся рэфэрат сп. Ант. Адамовіча на тэму „30-ыя ўгодкі заснаваньня „Узвышша". Удзельнікі канфэрэнцыі зь вялікай цікавасьцяй выслухалі гісторыю змагароў „Узвышша".

STUYVESANT CASINO

УКРАІНСКІ НАРОДНЫ ДОМ

140-142 2nd AVEUNE NEW YORK 3, N. Y.

мае да найма вялікія й меншыя залі на ўсялякія нагоды, як
ЗАБАВЫ — БАНКЕТЫ — ВЯСЕЛЬЛІ — ХРЭСЬБІНЫ — МІТЫНГІ
У вялікіх залях паветра ахалоджваецца (Air Conditioned).
Цэны прыступныя. У будынку свой рэстаран і бар.
Па інфармацыі: тэл.: GR 3-5289, або бачыць адміністратара ад 12-9 гадз. ўвечары

ТАННА Й ПРЫЕМНА ЛЕТКАВАЦЬ АБО ПРАВОДЗІЦЬ УІКЭНДЫ
Ў БЕЛАРУСКІМ ДОМЕ АДПАЧЫНКУ

А. БОБРЫКА

OLIVE BRIDGE, N. Y. (былы Tom Anderson House)
каля 100 міляў на поўнач ад Нью Ёрку
недалёка Kingston, Ulster County.
Цудоўныя Кэтскілскія горы, раскошныя лясы, здаровае горнае паветра,
вялікія танныя пакоі для адзінокіх і сем'яў, прыгожая заля,
выгодная кухня.
Пішэце або проста едзьце да:
Mr. A. BOBRYK, Olive Bridge, N. Y.

Спаткаьне Беларусаў Амэрыкі й Канады

Галоўная Управа Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня арганізуе сёлета экскурсію ў Канаду з мэтаю зладжаньня спаткаьня Беларусаў Амэрыкі й Канады ў Торонто.

Экскурсія адбудзецца 1, 2 і 3 верасьня. Выезд ізь Нью Ёрку плянуецца 31 жніўня ўвечары, а зварот у Нью Ёрк 3 верасьня.

Падарозе ў Торонто ўдзельнікі экскурсіі агледзяць колькі прыгожых мясьцінаў Амэрыкі й Канады, але галоўна вадаспад Ніягару, дзе будзе папас на 3-4 гадзіны.

Імпрэза спаткаьня Беларусаў Амэрыкі й Канады адбудзецца ў Торонто ў нядзелю 2 верасьня паводля ўзгодненай праграмы паміж БАЗА і Згуртаваньнем Беларусаў у Канадзе (ЗБК). Дакладней аб праграме спаткаьня ўдзельнікі экскурсіі будуць паведамленыя за колькі тыдняў да экскурсіі.

Падарожжа ізь Нью Ёрку адбудзецца спэцыяльна нанятым аўтабусам. Кошт экскурсіі 15 дал. на аплату падарожжа й 1 дал. на арганізацыйныя выдаткі, разам 16 дал. ад асобы.

ЗБК забясьпечыць жыльлё ўсім удзельнікам экскурсіі з Амэрыкі.

Кажны, хто жадае ўзяць удзел у экскурсіі й спаткаьні Беларусаў Амэрыкі й Канады, няхай паведаміць аб гэтым экскурсійны Камітэт, у які ўваходзяць сп. сп. Аўген Протас і Юрка Станкевіч, не пазьней як 20 ліпеня, перасылаючы пры гэтым і аплату ўдзелу ў экскурсіі.

У справе экскурсіі просім зварачацца на наступны адрыс:

Byelorussian-American Ass'n,
33 Norfolk St., New York 2, N. Y.

На гэты-ж адрыс просім слаць і грошы.

Галоўная Управа гэтым заклікае ўсе аддзелы БАЗА зарганізаваць удзел сваіх сяброў у спаткаьні Беларусаў Амэрыкі й Канады. Аддзелы Кліўленд, Дэтройт, Чыкаго й Пэорыя няхай самастойна арганізуюць выезд у Торонто, бяручы на ўвагу агульны плян экскурсіі й 2 верасьня — дзень спаткаьня ў Торонто. Сябры іншых аддзелаў будуць карыстацца паслугамі Экскурсійнага Камітэту.

Спадзяючыся, што экскурсія ў Канаду будзе вельмі цікавай, карыснай і добра арганізаванай, Галоўная Управа БАЗА заахвочвае ўсіх узяць у ёй удзел.

Галоўная Управа БАЗА

У СПРАВЕ НАБЫЦЬЦЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ДОМУ Ў НЬЮ ЁРКУ

Камітэт набыцьця Беларускага Народнага Дому й Царквы ў Нью Ёрку ветліва заклікае беларускае грамадзтва ў Амэрыцы пасьпяшыцца із сплатай удзелу ў Фонд набыцьця бо „хто цяперака заплаціць — заплаціць двойчы".

Грошы просіцца перасылаць на адрыс:

Mr. D. Klincevich
1148 Blake Ave., Brooklyn 8 ,N. Y.

Камітэт арганізуе 22 ліпеня сёлета пікнік у прыгожым месцы каля Бікану. Увесь прыбытак з пікніку, калі такі будзе, прызначыцца ў Фонд набыцьця дому. У справе пікніку Камітэт разашле індывідуальныя паведамленьні, але ўжо гэтым ветліва просіць узяць лічны ўдзел у летняй сяброўскай імпрэзе.

Ад лютага 1956 г. да сяньня заплацілі на Беларускі Народны Дом наступныя асобы, якім Камітэт складае шчырую падзяку:

78. Ул. Машанскі, Нью Брансўік	$150.00
79. А. Протас, Стэмфорд	150.00
80. Праф. Л. Акіншэвіч, Вашынгтон	25.00
81. М. Міцкевіч, Бруклін	100.00
Сума папярэдніх сплатаў . .	$3.976.36
Разам сплачана дагэтуль . .	4.401.36

Нью Ёрк, чырвень 1956.

К. Мерляк
Старшыня Камітэту набыцьця
БНД у Нью Ёрку

БІБЛІЯТЭКА БАЗА

Управа Бібліятэкі гэтым паведамляе ўсіх зацікаўленых, што Бібліятэка Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня адчыненая для грамадзкага карыстаньня што чаньвер ад 6 да 8 гадзіны ўвечары, пачынаючы ад 1 ліпеня 1956 г.

Бібліятэка месьціцца ў памешканьні Акруговай Управы БАЗА ў Нью Ёрку пад такім адрысам:

The Library of Byelorussian-American Association
33 Norfolk St., New York 2, N.Y.

Бібліятэка на пачатку свайго існаваньня яшчэ невялікая, але Управа спадзяецца, што беларускія навуковыя інстытуцыі й грамадзкія арганізацыі, а таксама прыватныя асобы борзда дапамомуць пабольшыць Фонд Бібліятэкі.

Яшчэ раз просім усіх прысылаць беларускія матар'ялы, як: кнігі, брашуры, часапісы й наагул усе беларускія выданьні, а таксама й літаратуру ў іншых мовах аб Беларусі для папаўненьня бібліятэкі ды наведваць бібліятэку й карыстацца зь ейных матар'ялаў.

Управа Бібліятэкі БАЗА

БЕЛАРУСКІЯ КРУЖЭЛКІ

Выдавецкі Аддзел пры Галоўнай Управе Злучанага Беларуска-Амэрыканскага Дапамаговага Камітэту выпусьціў на кружэлках награныя хорам пад кіраўніцтвам сп. В. Селях-Качанскага, акамп. П. Нядзьвецкі ў Студыі Ар. Сі. Эй. Біктар, наступныя беларускія песьні:

1. Гэй, сябры удалыя	Мэл. Тэраўскага, гарм. Качанскага
2. Люблю наш край	Словы К. Буйла, гарм. Качанскага, солё Н. Сіцько
3. Каліна-маліна	Гарм. Равенскага
4. А ў садзе рэчанька	Мэл. Тэраўскага
5. Міма садзіка	Гарм. Равенскага
6. Вечарком за рэчкаю	Гарм. Равенскага
7. Полька „Янка"	Мэл. Тэраўскага, гарм. Качанскага
8. Пайшоў мілы лужком	Гарм. Качанскага
9. Ці ня быстрая рэчка	Мэл. Тэраўскага
10. Лявоніха	Гарм. Нікалаевіча
11. Сваток	Нар., солё Л. Г. Янушкевіч-Нядзьвіга
12. Хлопец пашаньку пахае	Нар., солё Л. Г. Янушкевіч-Нядзьвіга
13. Чаму-ж мне ня пець	Нар., солё Л. Г. Янушкевіч-Нядзьвіга

Гэтым-жа самым хорам, пад акампаніямэнт кампазытара Д. Верасава, рыхтуецца да насьпеўваньня яшчэ 10 найбольш папулярных патрыятычных песьняў.

Ветліва просім усё беларускае грамадзтва падтрымаць гэты выдавецкі пачын праз набыцьцё вышэйвыменепых кружэлак. Цана кружэлкі зь перасылкай — 1 ам. даляр. Выпісваць можна па наступным адрасе:

MICHAS SIENKO, 24 Herman St., South River, N. J. U.S.A.

Рэдагуе Рэдакцыйная Калегія
Падпіска на год — $ 2.50.
Subscription per year — $ 2.50

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011